www.gazeta.bsu.by

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

БДУ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

31 сакавіка 2005 года, № 7 (1915)

ПОМНІКІ БДУ



*"Беларускі універсітэт" прадстаўляе новы праект — "Помнікі БДУ". На старонках газеты мы будзем расказваць пра выдатных беларускіх дзеячоў і асветнікаў, скульптуры якіх размешчаны ў дворыку універсітэцкага гарадка. У гэтым нумары чытайце пра аднаго з найбуйнейшых паэтаў-гуманістаў эпохі Адраджэння Міколу ГУСОЎСКАГА.*

*(Стар. 6)*

КОНКУРСЫ

## НАЙЛЕПШЫЯ СТУДЭНТЫ-НАВУКОЎЦЫ

***У сярэдзіне сакавіка былі падведзены вынікі Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў ВНУ. У ім удзельнічалі 2288 студэнтаў з 38 дзяржаўных і 7 прыватных ВНУ. Каля 30 % работ прысвячаліся прыродазнаўчай тэматыцы, каля 20 % — тэхнічнай, астатнія — гуманітарнай.***

15 сакавіка адбылася цырымонія ўручэння дыпломаў лаўрэатам конкурсу. На ўрачыстасці прысутнічалі міністр адукацыі А.М. Радзькоў, першы намеснік А.І. Жук (старшыня аргкамітэта), намеснік старшыні пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе І.В. Катляроў (намеснік старшыні аргкамітэта), першы намеснік старшыні ВАК Рэспублікі Беларусь А.А. Афанасьеў (намеснік старшыні аргкамітэта), віцэ-прэзідэнт НАНБ А.І. Лесніковіч, рэктар БДУІР М.П. Батура. Дыпломы атрымалі 9 студэнтаў БДУ — гэта найлепшы паказчык сярод ВНУ Беларусі: **Ала Базылева** (хімфак), **Сяргей Вайтовіч** (гістфак), **Кацярына Варанцова** (філфак), **Андрэй Кажэмакс** (ФФСН), **Вера Кудрашова** (біяфак), **Кірыла Кузьмін** (мехмат), **Вікторыя Навіцкая** (ФФСН), **Ганна Нікалаева-Шчацько** (ФРФіЭ), **Сяргей Рабчынскі** (хімфак). Акрамя таго, 20 конкурсных работ студэнтаў БДУ атрымалі першую катэгорыю, 34 — другую, 28 — трэцюю. Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі адзначана шматгадовая праца дацэнта факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ Івана Сцяпанавіча Манака па падрыхтоўцы лаўрэатаў конкурсу.

Дарэчы, кокурс праводзіўся з дапамогай аўтаматызаванай інфармацыйна-аналітычнай сістэмы, распрацаванай сакратарыятам конкурсу — супрацоўнікамі аддзела навукова-даследчай работы студэнтаў. Яна прадугледжвае магчымасць беспапяровага, віртуальнага механізму правядзення конкурсу і ўключае дыялогавы Internet-сайт, сістэму збору інфармацыі, банк даных, аўтаматызаваную сістэму падтрымкі прыняцця рашэнняў, аўтаматызаваныя сістэмы фармавання дакументаў, электронную даведку.

**А.Г. ЗАХАРАЎ,**
**адказны сакратар конкурсу, начальнік аддзела НДРС УПКВК ГУН**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## МІЖНАРОДНЫ АДУКАЦЫЙНЫ ФОРУМ

***Міжнародны форум "Адукацыя для ўстойлівага развіцця: на шляху да грамадства ведаў" адбудзецца 5—6 красавіка ў Мінску.***

Разам з ім пройдуць X канферэнцыя міністраў адукацыі дзяржаваў-удзельніц СНД і XVII пасяджэнне Савета па супрацоўніцтве ў галіне адукацыі дзяржаваў-удзельніц СНД.

Арганізатарамі форуму выступаюць ЮНЕСКА, Савет па супрацоўніцтве ў галіне адукацыі дзяржаваў-удзельніц СНД, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны універсітэт, а таксама ЮНІСЕФ. Паводле задумы арганізатараў, мерапрыемства для кіраўнікоў і работнікаў сістэмы адукацыі заклікана наладзіць абмен інавацыйнымі методыкамі, перадавым досведам, ключавымі вынікамі і падыходамі да рэфармавання сістэмы адукацыі. Вынікам форуму павінна стаць аптымізацыя намаганняў работнікаў сістэмы адукацыі краін СНД, накіраваных на рэалізацыю згаданых рэформаў у кантэксце глабалізацыі, адаптацыі сусветных тэндэнцый да нацыянальных умоваў і індывідуалізацыі адукацыі.

З асноўнымі дакладамі на форуме выступяць міністр адукацыі Беларусі А.М. Радзькоў, рэктар БДУ, старшыня Савета па супрацоўніцтве ў галіне адукацыі дзяржаваў-удзельніц СНД, прафесар В.І. Стражаў, а таксама прадстаўнік ЮНЕСКА. Удзельнікі мерапрыемства будуць працаваць у 9 секцыях: "Рэалізацыя праграмы ЮНЕСКА "Адукацыя для ўсіх", "Прафесійная адукацыя для ўстойлівага развіцця", "ВІЧ/СНІД і адукацыя", "Інтэграцыя ў сферы вышэйшай адукацыі і Балонскі працэс", "Сацыяльная ўключанасць", "Якасць адукацыі", "Вышэйшая школа і навука", "Адукацыя без межаў", "Экалагічная адукацыя і яе роля ва ўстойлівым развіцці грамадства". Падчас працы форуму адбудзецца таксама "круглы стол" з удзелам кіраўнікоў ЮНЕСКА і міністраў адукацыі СНД "Перспектывы развіцця ўзаемадзеяння СНД і ЮНЕСКА ў галіне адукацыі".

**Паводле інфармацыі ўпраўлення па міжнародных сувязях**

*Працяг тэмы на 4-й старонцы*

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**СТУДЭНТЫ РУХАЮЦЬ НАВУКУ**
Лаўрэаты конкурсу навуковых работ студэнтаў
Стар. 2

**ЯК ЖЫВЕЦЦА СТУДЭНТУ-ПЛАТНІКУ Ў БДУ?**
Інтэрв'ю з Яўгенам Фёдаравічам БАНДАРЭНКАМ, начальнікам Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы
Стар. 3

**ГАВОРЫЦЬ І ПАКАЗВАЕ... КНІГА**
На гістарычным факультэце створаны электронны падручнік "Вялікая Айчынная вайна ў кантэксце Другой сусветнай вайны"
Стар. 4

**ДЗЯЦІНСТВА, АПАЛЕНАЕ ВАЙНОЙ**
Успаміны пра вайну прафесара Дзмітрыя Сцяпанавіча УМРЭЙКІ
Стар. 5

## АФІЦЫЙНА

### НОВЫЯ ПРЫЗНАЧЭННІ

Павел Вітальевіч СКАЛАБАН прызначаны начальнікам упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю.

Кандыдат філалагічных навук Сяргей Валянцінавіч ДУБОВІК прызначаны дэканам факультэта журналістыкі.

## ВІНШУЕМ!

***Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ 1 красавіка адзначыць сваё 35-годдзе.***

У гонар гэтага юбілею ў канцэртнай зале "Мінск" пройдзе святкаванне. З праграмай і парадкам атрымання білетаў можна азнаёміцца на сайце факультэта (www.fpmi35.bsu.by). "Беларускі універсітэт" далучаецца да віншаванняў і цёплых слоў, якія гучаць цяпер у адрас аднаго з найлепшых факультэтаў БДУ. Рэпартаж са святкавання чытайце ў наступным нумары газеты.

## ДА 60-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ

### КОНКУРС ДЛЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

***У рамках святкавання 60-годдзя Перамогі сярод студэнтаў факультэта журналістыкі БДУ праводзіцца конкурс на лепшую публікацыю, прысвечаную тэме Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.***

Мэта конкурсу — стымуляваць даследчую і творчую дзейнасць студэнтаў, развіваць іх патрыятычныя пачуцці. Студэнты ўсіх курсаў факультэта прадстаўляюць на конкурс публікацыі на тэму вайны, выкананыя ў розных журналісцкіх жанрах, надрукаваныя ў перыяд з 1 верасня 2004 г. па 10 мая 2005 г. Матэрыялы могуць быць надрукаваны на старонках перыядычных выданняў Рэспублікі Беларусь, у вучэбнай газеце факультэта "Журналіст" і ў спецвыпуску гэтай газеты, прысвечаным 60-годдзю Перамогі.

Работы студэнтаў будзе ацэньваць журы, у якое ўвайшлі выкладчыкі факультэта журналістыкі: доктар філалагічных навук, прафесар Тацццяна Дзмітрыеўна Арлова, доктар філалагічных навук, прафесар Іван Іванавіч Сачанка, доктар гістарычных навук, прафесар Алег Георгіевіч Слука, доктар філалагічных навук, прафесар Барыс Васільевіч Стральцоў, доктар філалагічных навук, прафесар Галіна Казіміраўна Тычко.

Работы ацэньваюцца шляхам выстаўлення балаў па 10-бальнай сістэме. Пераможцы вызначаюцца па колькасці набраных балаў. Пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца грашовымі прэміямі. І месца — 1 прэмія, ІІ месца — 2 прэміі, ІІІ месца — 3 прэміі. Акрамя таго, уведзены 4 заахвочвальныя прэміі.

Падвядзенне вынікаў конкурсу адбудзецца ў маі 2005 г. на пленарным пасяджэнні 62-й навукова-практычнай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў "Беларуская журналістыка — 2005", па выніках якой будзе надрукаваны зборнік лепшых работ.

Юлія ПАПОВА

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

# СТУДЭНТЫ РУХАЮЦЬ НАВУКУ

***Карэспандэнтка "Беларускага універсітэта" сустрэлася з некалькімі лаўрэатамі конкурсу навуковых работ студэнтаў ВНУ Беларусі за 2004 г.***

## ЭКСПЕРЫМЕНТЫ Ў НАНАХІМІІ



Сяргей **РАБЧЫНСКІ, аспірант хімічнага факультэта,** быў адзначаны за работу "Фота-электрахімічнае фарміраванне нанапамерных час-цінак селенідаў металаў з выкарыстаннем полі-крышталічных Se-электродаў". Аб'ект яго даследавання — ультрадысперсныя сістэмы на аснове паўправадніковых халькагенідаў, у прыватнасці селенідаў металаў. Гэта вельмі дробныя часцінкі (а дакладней — нанапамерныя), даследчыку даводзіцца мець справу з вельмі тонкімі плёнкамі — таўшчынёй менш за 1 мікраметр. На сённяшні дзень метады атрымання такіх часцінак цікавяць навукоўцаў многіх краін свету. Іх можна прымяняць у оптаэлектроніцы, а тонкія полікрышталічныя плёнкі паўправаднікоў выкарыстоўваюцца ў сістэмах пераўтварэння сонечнай энергіі ў электрычную.

Тое, што менавіта яго работу адзначылі, Сяргей лічыць падтрымкай на навуковым шляху, сапраўдным заахвочваннем. "Навуковы шлях нялёгкі, — прызнаецца хімік, — паміж тэарэтычнымі развагамі і адкрыццём знаходзіцца не адзін эксперымент. І не кожны з іх удалы". Паколькі хімія патрабуе пастаянных эксперыментаў, навуковец звычайна па 8 гадзін у дзень праводзіць у лабараторыі.

Практычная частка работы Сяргея Рабчынскага — атрыманне наначасцінак, якія многія навукоўцы спрабуюць вывучыць, даследаваць. Традыцыйныя метады звязаны з дарагой апаратурай, а вось электрахімічны метад з'яўляецца больш танным у параўнанні, напрыклад, з вакуумнымі тэхналогіямі і менш шкодным для навакольнага асяроддзя. Па словах Сяргея, навукоўцы зацікаўлены ў тым, каб зрабіць элементы інтэгральнай мікрасхемы меншымі па памерах, больш кампактнымі. Але вядома, што ўласцівасці дробных паўправадніковых часцінак у значнай ступені залежаць ад іх памеру. Таму каб распрацаваць прыбор на іх аснове, трэба навучыцца атрымоўваць часцінкі строга вызначанага памеру. "У мяне яны пакуль атрымліваюцца рознымі па памерах, — кажа Сяргей. — Да дасканаласці яшчэ далёка, таму будзем працаваць".

## ДАПАМОГА ДЛЯ ВЫКЛАДЧЫКА



**Сяргей ВАЙТОВІЧ, студэнт V курса гістарычнага факультэта** — аўтар работы "Дыягнастычны інструментарый для маніторынгу якасці гістарычнай адукацыі". Сяргей патлумачыў, што такім інструментарыем з'яўляюцца пэўныя праграмы, якія дазваляюць павысіць узровень ведаў навучэнцаў і пры гэтым становяцца сродкам падтрымкі для выкладчыка (напрыклад, сродкі тэставага кантролю ведаў). Ужо цяпер распрацоўкі Сяргея выкарыстоўваюцца некаторымі выкладчыкамі на факультэце, вядзецца работа і па ўкараненні іх у сярэдняй школе. І гэта вельмі важна, бо сам Сяргей зацікавіўся гісторыяй менавіта ў школе. Ва універсітэце звязаў сваё жыццё з навукай, якую лічыць цяжкой, карпатлівай працай. Вядома ж, прыемна, калі яе ўзнагароджваюць (як гэта здарылася на нядаўнім конкурсе). Заняткі навукай адбіраюць шмат часу (Сяргей вучыцца на апошнім курсе: трэба канцэнтравацца на падрыхтоўцы дыпломнай работы), але хлопец упэўнены, што гісторыя вартая гэтых намаганняў.

## ПАМІЖ ЛІТАРАТУРАЙ І ФІЛАСОФІЯЙ



**Андрэй КАЖЭМАКС, нядаўні выпускнік факультэта філасофіі і сацыяльных навук,** быў узнагароджаны за работу пад назвай "Літаратурны дыскурс у сучасных філасофскіх ведах". У рабоце аўтар разглядае трансфармацыю філасофскага мыслення ад некласічнага да постнекласічнага на ўзроўні пісьма. Даследаванне, угрунтаванае на працах Бадрыяра і Дэрыды, скіравана на вывучэнне самога філасофскага светаадчування. Андрэй кажа, што межы паміж постмадэрнісцкай літаратурай і філасофіяй размыты.

Лаўрэат спадзяецца, што ў будучыні на аснове яго даследавання людзі змогуць растлумачыць і нават спрагназаваць культурныя зрухі ў сферы мыслення, а таксама разабрацца ў працэсе трансфармацыі, руху філасофскай думкі. "Я вучуся ў аспірантуры. Тое, над чым працую зараз, з'яўляецца лагічным працягам даследавання, за якое атрымаў узнагароду", — расказвае Андрэй. Праўда, цяпер ён перайшоў ад вузкай накіраванасці на вялікае поле ўзаемасувязей.

## СЛОВАТВОРЧАСЦЬ ПАДЛЕТКАЎ



**Кацярына ВАРАНЦОВА, выпускніца філалагічнага факультэта,** прадстаўляла на конкурсе работу пад назвай "Словатворчасць падлеткаў: структурна-семантычны аспект". У аснове гэтай навуковай працы ляжыць эксперымент, і пастаўлены Кацярынай падчас працы ў арганізацыі "Беларускі зялёны крыж". Дзяўчына распрацавала ўласную праграму "У пошуках вытокаў", скіраваную на прапаганду фальклору і міфалогіі. Адным з важных структурных элементаў праграмы з'яўлялася гульня "Сусветнае дрэва". Навукоўца працуе з матрыцай — своеасаблівай мадэллю, якую можа мяняць у залежнасці ад мэты даследавання. Удзельнікам эксперыменту (звычайна гэта вучні 9—11-х класаў, якія працуюць у групах па 15 чалавек) трэба "насяліць" сусветнае дрэва багамі і дэманалагічнымі істотамі, вызначыць іх функцыі, даць кожнаму імя. Даследаванне мае 3 кірункі: рэканструкцыя карціны свету падлеткаў, аналіз словаўтваральнай структуры намінацый, гендэрная характарыстыка крэатыўнага працэсу ў цэлым.

Да V курса студэнтка працавала над іншай тэмай, але на выпускным курсе вярнулася да вывучэння словаўтварэння. За гэта Кацярына вельмі ўдзячна свайму кіраўніку — доктару філалагічных навук, прафесару Т.М. Валынец, якая дапамагала ёй. Намаганні іх не аказаліся марнымі: работа Кацярыны Варанцовай была прызнана найлепшай на курсе. Матэрыял даследавання можа быць выкарыстаны на спецкурсах па словаўтварэнні, кагнітыўнай і гендэрнай лінгвістыцы, а таксама па тэорыі намінацый. Гендэрныя напрацоўкі даследавання могуць спатрэбіцца сацыёлагам.

Кацярына Варанцова — дзяўчына мэтанакіраваная. Яшчэ ў 9-м класе яна, удзельніца шматлікіх навукова-практычных канферэнцый, цвёрда вырашыла, што будзе вучыцца ў аспірантуры. Яе надзеі спраўдзіліся. "Гэтая навуковая работа — мой улюбёны твор, таму вельмі прыемна, што яе ацанілі па заслугах, — кажа Кацярына. — Навука адбірае ўвесь час, інакш гэта не навука". На пытанне пра планы на будучыню Каця з усмешкай адказала: "На ўзнагароджанні нам, лаўрэатам, сказалі, што кожны павінен імкнуцца стаць акадэмікам. Матэрыял, над якім я працую, даволі гнуткі — дазваляе паглыбляцца і пашырацца. Тут ёсць над чым працаваць, і ёсць стымул, бо навука — вялікі спорт, у якім ты спаборнічаеш не толькі з канкурэнтамі, але і з самім сабой".

**Ала МАЧАЛАВА**
**Фотаздымкі аўтара**

# ЯК ЖЫВЕЦЦА СТУДЭНТУ-ПЛАТНІКУ Ў БДУ?

***У БДУ платнікі і бюджэтнікі вучацца разам і па адных праграмах. А што розніць іх? І ўвогуле, якое становішча студэнта-платніка ў БДУ? Пра ўсе гэта я вырашыла спытаць у Яўгена Фёдаравіча БАНДАРЭНКІ, начальніка Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы БДУ.***

**— Яўген Фёдаравіч, якія ў БДУ суадносіны колькасці платнікаў і бюджэтнікаў?**

— На факультэтах БДУ навучаецца каля 15 тысяч студэнтаў дзённай формы навучання, з іх каля 40 % платнікаў, астатнія бюджэтнікі. Дарэчы, удзельная вага бюджэтнікаў у БДУ — адна з вышэйшых сярод ВНУ краіны. Хаця, магчыма, у перспектыве гэтыя суадносіны будуць мяняцца на карысць платнікаў. Колькасць бюджэтных месцаў павялічвацца наўрад ці будзе. Але ахвотных вучыцца ў БДУ большае, таму будзе расці менавіта колькасць платнікаў.

**— На якія сродкі, апрача асабістых, могуць вучыцца студэнты-платнікі?**

— Студэнт можа часткова або цалкам навучацца за кошт дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый і прадпрыемстваў, у якіх працуюць яго бацькі. Існуе форма аплаты пры дапамозе розных фондаў — як беларускіх, так і замежных. Ёсць тыя, хто навучаецца за кошт спонсарства з боку замежных грамадзян.

З 2003 года згодна з Указам Прэзідэнта Беларусі № 616 ад 17 снежня 2002 г. у студэнтаў з'явілася магчымасць навучацца за кошт крэдыту, які прадастаўляе "Беларусбанк": студэнту трэба аплаціць толькі 30 % кошту навучання. Выплачваць крэдыт ён пачынае праз месяц пасля атрымання дыплома. Я лічу, што гэта вельмі зручны спосаб атрымання адукацыі. У цяперашні час крэдытам карыстаюцца каля 300 нашых студэнтаў.

**— На што ідуць грошы, атрыманыя ад аплаты за навучанне?**

— За кошт сродкаў платнікаў аплачваецца чвэрць усіх расходаў на арганізацыю навучальнага працэсу ва універсітэце. Перш за ўсё гэтыя сродкі ідуць на аплату дзейнасці прафесарска-выкладчыцкага саставу і навучальна-дапаможнага персаналу. Каб захаваць якасць адукацыі на належным узроўні, патрэбны педагогі адпаведнай кваліфікацыі. Норма для БДУ — 1 выкладчык на 6 студэнтаў. У большасці беларускіх ВНУ, дарэчы, гэтыя суадносіны — 1:10.

Акрамя таго, гэтыя грошы выдаткоўваюцца на матэрыялы, абсталяванне, рамонт і набыццё камп'ютарных сродкаў, будаўніцтва новых будынкаў факультэтаў, аплату паслуг сувязі. Напрыклад, выдаткі на Інтэрнэт на 75 % забяспечваюцца за кошт сродкаў платнікаў. Гэта дазваляе універсітэту мець высокахуткасны доступ (у 4 разы хутчэйшы, чым у ВНУ, якія аплачваюць такую паслугу толькі з бюджэтных сродкаў).

**— Якія спецыяльнасці сёння найбольш запатрабаваныя? Навучанне па якіх з іх самае дарагое?**

— Звычайна гэта адны і тыя ж спецыяльнасці. Самая высокая аплата — на юрыдычным факультэце і факультэце міжнародных адносін: у сярэднім 1500 долараў ЗША ў год. Самая нізкая — у Дзяржаўным інстытуце кіравання і сацыяльных тэхналогій: 650—1000 долараў ЗША ў год. Для параўнання: паводле звестак за жнівень мінулага года, на навучанне бюджэтнікаў штогод дзяржава выдаткоўвае 1900 долараў ЗША.

**— Але для навучання на фізічным, хімічным і біялагічным факультэтах трэба нашмат больш абсталявання, чым, напрыклад, на ФМА. Чаму на гэтых факультэтах кошт навучання ніжэйшы?**

— Сярэдні кошт навучання на гэтых факультэтах сапраўды ніжэйшы. Мы пайшлі на такі крок, каб заахвоціць студэнтаў атрымліваць менавіта гэтыя спецыяльнасці. Пакуль яны не карыстаюцца ў моладзі такім попытам, як, напрыклад, юрыдычныя ці эканамічныя.

**— Ці ўлічваецца пры распрацоўцы плана прыёму на платнае аддзяленне наяўнасць навучальна-лабараторнай базы, неабходнай для забеспячэння высокай якасці навучання?**

— Безумоўна, улічваецца. Галоўнае для універсітэта — забяспечыць магчымасць атрымаць якасную адукацыю для кожнага студэнта. Разам з тым, неабходна прызнаць, што ва універсітэце існуе праблема недахопу вучэбных памяшканняў. Напрыклад, юрыдычны факультэт арандуе памяшканні ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі. Недастаткова месца на факультэце журналістыкі. Ад недахопу плошчаў тры факультэты ў будынку па вул. К. Маркса: філалагічны, ФФСН і эканамічны — вымушаны займацца ў тры змены. У бліжэйшыя гады, у адпаведнасці з планамі будаўніцтва, праблема павінна вырашыцца.



Але атрымаць якасную адукацыю кожны наш студэнт можа і сёння, было б толькі жаданне.

**— Многія платнікі мараць пра тое, каб знізіць плату за навучанне ці нават перайсці на бюджэтную форму. Як гэта можна зрабіць?**

— Сёння ва універсітэце выпрацавана цэлая сістэма скідак для паспяховых студэнтаў-платнікаў. Ужо на стадыі залічэння, калі абітурыент атрымаў на ўступных экзаменах паўпрахадны бал (пры якім частка абітурыентаў залічваецца на бюджэт, а частка — на платнае навучанне), рашэннем прыёмнай камісіі кошт навучання яму можа быць зніжаны.

Акрамя таго, у адпаведнасці з "Палажэннем аб платным навучанні на дагаворнай аснове ў БДУ" студэнты-платнікі, якія вучацца на "выдатна", маюць права на зніжэнне памеру аплаты. Яно прызначаецца тэрмінам на 1 год у адпаведнасці з сярэднім балам паспяховасці за мінулы перыяд навучання. Спярша аплату можна знізіць на 25 %, на наступны год — на 50 %, а потым нават перайсці на 100-працэнтнае зніжэнне аплаты ці бюджэтнае навучанне. Дарэчы, са стопрацэнтным зніжэннем аплаты кожны год у нас навучаецца каля 160—180 чалавек.

**— Сёння бал пераводу на меншую аплату за навучанне па гуманітарных спецыяльнасцях складае 8,75, а на прыродазнаўчых — 8,05. Ці не надта высокая гэта разбежка? І ці не надта высокі сам бал?**

— Матэматычна ўсё разлічана правільна, але ёсць адзін нюанс. Пасля пераходу на 10-бальную сістэму многія выкладчыкі неахвотна ставяць "9" і "10". Мы параўналі колькасць выдатнікаў на аналагічных курсах па 5-бальнай і 10-бальнай сістэме, і высветлілася, што цяпер выдатнікаў стала менш. Таму я лічу, што бал пераводу гуманітарыяў трэба панізіць. Гэта сапраўды праблема.

**— Як Вы ставіцеся да такой ідэі: па выніках летняй сесіі складаецца рэйтынг. Першыя 50 % студэнтаў у гэтым рэйтынгу будуць увесь наступны год вучыцца на бюджэтнай форме, а астатнія, адпаведна, на платнай.**

— Гэтая сістэма працуе ў парадку эксперыменту ў БДУІР. Трэба пачакаць яго вынікаў. Таму ў БДУ яе пакуль што ўводзіць не збіраюцца.

**— Студэнт-платнік можа перайсці на бюджэт. А ці можа бюджэтнік перайсці на платнае аддзяленне?**

— Спецыяльнай працэдуры такога пераводу няма. Але калі студэнт выкажа такое жаданне, яму дазволяць перавесціся.

**— За актыўны ўдзел у жыцці універсітэта студэнт-платнік, у адрозненне ад студэнта-бюджэтніка, не можа атрымліваць прэміі. Чаму?**

— Выплата прэмій платнікам сапраўды не прадугледжваецца. Я згодны, што гэта несправядліва. Але гэтую праблему немагчыма вырашыць на універсітэцкім узроўні. Магчымасць прэміравання платнікаў павінна быць прапісана ў парадку расходавання пазабюджэтных сродкаў, які вызначаюць Міністэрства эканомікі і Міністэрства фінансаў.

**Паводле звестак, у 2004 годзе ў сярэднім па Расіі кошт навучання студэнта-платніка складаў 930 долараў ЗША за год, у Маскве — 1300. У БДУ сярэдні кошт навучання студэнта-платніка за 2004/2005 навучальны год з улікам усіх ільготаў склаў 789 долараў ЗША.**

**— А ў астатнім студэнт-платнік мае аднолькавыя правы са студэнтам-бюджэтнікам?**

— Правы на атрыманне ведаў у іх аднолькавыя. З 1 верасня мінулага года за інтэрнат усе студэнты плацяць аднолькава. Пры арганізацыі паездак за мяжу адрозненняў таксама няма. Асноўнае адрозненне сёння — бюджэтнікі маюць права на першачарговае засяленне ў інтэрнат.

**— Якім Вы бачыце далейшае развіццё сферы платных адукацыйных паслуг у БДУ?**

— Чакаецца, што ў 2007—2009 гг. рэзка ўпадзе конкурс ва ўсе ВНУ краіны. Гэта тлумачыцца "дэмаграфічнай ямай", якая ўзнікла на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Рэакцыяй на гэта хутчэй за ўсё стане змяншэнне навучальных месцаў у ВНУ. Але калі выкладчыкі (а гэта наш асноўны капітал!) не будуць задзейнічаны ў навучальным працэсе, магчымы іх адток альбо ў іншыя сферы дзейнасці ўнутры Беларусі, альбо нават за мяжу. Я лічу, што адзін з асноўных напрамкаў вырашэння праблемы — ужо сёння развіваць універсітэцкую сістэму павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. Рынак паслядыпломнай адукацыі, дадатковых адукацыйных паслуг хуткімі тэмпамі расце ва ўсім свеце, будзе расці і ў нашай краіне. Універсітэту неабходна заняць годнае месца на гэтым рынку.

Акрамя таго, хутчэй за ўсё будзе павышацца і кошт навучання. Па-першае, пастаянна растуць выдаткі на матэрыяльна-тэхнічнае забяспячэнне навучальнага працэсу. Для атрымання якаснай адукацыі крэйды, дошкі і парты ўжо даўно недастаткова: сёння для гэтага неабходны і камп'ютары, і іншая сучасная тэхніка. Па-другое, калі мы жадаем утрымаць ва універсітэце найлепшых кадры выкладчыкаў, павінен расці іх заробак, частка якога таксама выплачваецца за кошт пазабюджэтных сродкаў.

**Юлія ПАПОВА**

## АБ'ЯВЫ

### РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, фізічнай хіміі, геаграфічнай экалогіі, гісторыі беларускай мовы, гісторыі беларускай літаратуры, гісторыі паўднёвых і заходніх славян, сучасных замежных моў;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: беларускай літаратуры і культуры, тэарэтычнай фізікі;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай матэматыкі і інфарматыкі, лікавых метадаў і праграміравання, фізіялогіі і біяхіміі раслін, батанікі, заалогіі, этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, філасофіі і метадалогіі навукі, сацыялогіі, псіхалогіі, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай электронікі, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, беларускай літаратуры і культуры, эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, сучасных замежных моў, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, нямецкай мовы, раманскіх моў, фізічнага выхавання і спорту;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізіялогіі і біяхіміі раслін, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, нямецкай мовы, сучасных замежных моў;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: біяфізікі, агульнай матэматыкі і інфарматыкі.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, БДУ, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

### УСТАНОВА БДУ "НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ФІЗІКА-ХІМІЧНЫХ ПРАБЛЕМ"

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:

вядучага навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі тонкіх плёнак;

старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі тонкіх плёнак;

навуковага супрацоўніка лабараторыі нанахіміі;

навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі тонкіх плёнак.

*Тэрмін падачы дакументаў — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Дакументы прымаюцца на адрас: 220050, г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, аддзел кадраў НДІ ФХП БДУ.**

### ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады:

загадчыка кафедры кіравання фінансамі і маёмасцю.

*Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10**

## ПАДЗЕІ

### АСАЦЫЯЦЫЯ БІЗНЕС-АДУКАЦЫІ

***Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ разам з Гродзенскім дзяржуніверсітэтам імя Янкі Купалы заснаваў Беларускую асацыяцыю бізнес-адукацыі.***

Гэта некамерцыйная арганізацыя, якая ставіць сваёй асноўнай мэтай дзейнасць у сферы бізнес-адукацыі. Асацыяцыя накіравана на вырашэнне наступных задачаў:

каардынаваць работу навучальных установаў у сферы бізнес-адукацыі;

спрыяць стварэнню і забяспечваць развіццё ўстановаў бізнес-адукацыі;

арганізоўваць і ажыццяўляць праграмы павышэння кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага складу ўстановаў бізнес-адукацыі;

спрыяць удасканальванню методыкі выкладання, праводзіць даследаванні і ацэньваць якасць праграмаў навучання;

арганізоўваць супрацоўніцтва з арганізацыямі, якія маюць магчымасць аказваць фінансавую дапамогу ў развіцці праграмаў навучання;

праводзіць навуковыя канферэнцыі і арганізоўваць семінары;

выдаваць навучальную, навуковую, метадычную літаратуру, спецыялізаваныя выданні.

Старшынёй арганізацыі абраны дырэктар Інстытуту бізнесу і менеджменту тэхналогій нашага універсітэта У.У. Апанасовіч. Пра яе дзейнасць можна даведацца на сайце (www.sbmt.by). Асацыяцыя адкрыта для прыёму новых членаў.

## ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

### СТЫПЕНДЫІ ДЛЯ МАЛАДЫХ НАВУКОЎЦАЎ

***Пасольства Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь анансавала пачатак конкурсу на атрыманне стыпендый урада Польшчы для маладых навукоўцаў на 2005—2006 навучальны год.***

Стыпендыя пакрывае наступныя выдаткі: кошт навучання, пражывання і харчавання на час знаходжання ў Польшчы. Тэрмін навучання ў адной з польскіх ВНУ — 9 месяцаў.

Патрабаванні да кандыдатаў:

1. Закончаная вышэйшая адукацыя па адной са спецыяльнасцей: міжнародныя адносіны, гісторыя, паліталогія, сацыялогія, этналогія, культуразнаўства, сацыяльная псіхалогія, адміністрацыя і кіраванне.

2. Да ўдзелу ў стыпендыяльнай праграме дапускаюцца таксама студэнты апошняга курса навучання.

3. Узрост — да 35 гадоў.

4. Добрае веданне польскай праблематыкі ў разрэзе адной са згаданых галінаў навуковых ведаў.

5. Веданне англійскай ці польскай моваў.

6. Магчыма праходжанне інтэнсіўнага курса польскай мовы ў верасні бягучага года.

Дакументы накіроўваюцца поштай на адрас Пасольства РП ў Беларусі да 30 красавіка 2005 г.

Дадатковую інфармацыю можна знайсці на Інтэрнэт-сайце пасольства (www.embassypoland.nsys.by) або атрымаць ва ўпраўленні міжнародных сувязяў БДУ (галоўны корпус, пакой 104).

**Паводле інфармацыі ўпраўлення па міжнародных сувязях**

## СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ПАДПІСАНЫ ДАГАВОР

***Доўгатэрміновы дагавор аб супрацоўніцтве падпісалі 22 сакавіка БДУ і Люблінскі тэхнічны універсітэт (Польшча). Подпісы пад дакументам паставілі рэктары абедзвюх ВНУ — Васіль Іванавіч Стражаў і Юзэф Кучмашэўскі.***



Такі дакумент паміж нашымі універсітэтамі падпісаны ўпершыню. Яго мэта — спрыяць развіццю і ўмацаванню сувязяў у галіне адукацыі, навукі і тэхналогіі. У адпаведнасці з дакументам паміж нашымі універсітэтамі будуць развівацца такія формы супрацоўніцтва, як абмен студэнтамі, магістрантамі, аспірантамі, дактарантамі для навучання, стажыроўкі, вучэбнай практыкі і абароны дысертацый; запрашэнне выкладчыкаў для чытання лекцый, абмену досведам і інфармацыяй па вучэбна-метадычнай рабоце, навучальных планах і праграмах; арганізацыя сумесных даследаванняў, канферэнцый, семінараў і іншых навуковых мерапрыемстваў; публікацыя навуковых, навучальных і метадычных матэрыялаў па выніках выканання сумесных работ; абмен навукова-тэхнічнай і навучальна-метадычнай літаратурай, перыядычнымі выданнямі.

**Фотаздымак Аляксандра СНАПКА**

## ДА 60-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ

# ГАВОРЫЦЬ І ПАКАЗВАЕ... КНІГА

***Самае цікавае навучанне — тое, што адбываецца як гульня. Нават калі навучэнцы — студэнты БДУ, ім, як вучням пачатковай школы, цікава паглядзець карцінкі, паслухаць песню, панаціскаць клавішы камп'ютара. Гістарычны факультэт улічыў усё гэта.***

Выкарыстанне найноўшых тэхналогій у навучальным працэсе не ў навіну для гістфака. "Першаадкрывальніцай" магчымасцяў электронных машын была кафедра гісторыі Расіі, якой у 1980-х кіраваў прафесар Ігар Вацлававіч Аржахоўскі. У 1984 г. на ўсесаюзнай канферэнцыі, якая адбывалася ў Мінску, БДУ ўпершыню прадставіў свае навучальныя праграмы па філасофіі і гісторыі. З таго часу вядзе свой адлік студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя (СНДЛ) "Гісторыя і камп'ютар", якая на сёння лічыцца вядучай у галіне распрацоўкі электронных навучальных матэрыялаў сярод краін СНД. Кіраўніцтва факультэта на чале з дэканам, кандыдатам гістарычных навук Сяргеем Мікалаевічам Ходзіным актыўна падтрымлівае працэс інфарматызацыі: некалі менавіта С.М. Ходзін быў ініцыятарам паказаў студэнцкіх распрацовак у гэтай галіне.

Кафедра крыніцазнаўства гістарычнага факультэта пачала актыўна выкарыстоўваць дасягненні інфарматыкі, каб разнастаіць, паглыбіць, а ў нечым і спрасціць працэс навучання сучасных студэнтаў. Адным з праектаў стала распрацоўка электроннага навучальнага выдання па курсе "Вялікая Айчынная вайна ў кантэксце Другой сусветнай вайны". У яго аснову лёг навучальны дапаможнік У. Сідарцова, В. Фаміна і С. Панава "Гісторыя Беларусі 1917—1996 гг. Навучальны дапаможнік для 9-га класа", а таксама матэрыялы тэматычных кампакт-дыскаў і Інтэрнэт-рэсурсаў. Кіраўнікамі праекта выступілі выкладчыкі кафедры крыніцазнаўства Алена Мікалаеўна Балыкіна, Сяргей Барысавіч Каўн, дырэктар СНДЛ Уладзімір Нічыпаравіч Сідарцоў, а таксама 5 студэнтаў з розных курсаў гістарычнага факультэта. Аўтарам ідэі стварэння падручніка можа лічыцца студэнт Мікіта Казелька. Яго курсавая работа "Вялікая Айчынная вайна ў кантэксце Другой сусветнай вайны" стала асновай першай версіі гэтага электроннага падручніка, распрацаванай яшчэ ў 2003 г. Неўзабаве ўзнікла і другая версія: на аснове першай яе стварыў студэнт Дзмітрый Бузун.

Сёлета падручнік удзельнічаў у конкурсе грантаў БДУ: гісторыкі занялі 8-е месца з 47 канкурэнтаў, увайшоўшы ў першую тройку гуманітарных праектаў.

Віртуальным падручнікам вельмі лёгка карыстацца. На галоўнай старонцы — пяціканцовая зорка, промні якой указваюць на гіперспасылкі раздзелаў праграмы — "Е-лекцыі", "Фотаальбом", "Хрэстаматыя", "Тэсціраванне", "Рэсурсы". Для дапамогі карыстальнікам існуе адмысловы раздзел "Даведка". Спярша карыстальнік павінен прайсці ўваходны тэст, па выніках якога "разумная" кніга дасць рэкамендацыі: перайсці да тэарэтычнай часткі (паслядоўнае вывучэнне ўсяго матэрыялу), трэнінгу ці кантролю. Дарэчы, паказальна, што ўваходны тэст студэнты здаюць у сярэднім на 3,1 бала, а выходны (пасля вывучэння курса) — на 9,8.

Потым студэнт можа выбіраць сам: пагартаць параграфы па патрэбных яму тэмах, паглядзець тэксты першакрыніцаў, прагледзець фатаграфіі ці кадры хронікі, праслухаць гукавыя фрагменты. Інфармацыйна-дэманстрацыйны раздзел падручніка змяшчае больш за 200 слайдаў, 120 ілюстрацый, 3 відэафрагменты, 5 фанаграм, банк заданняў для замацавання і кантролю ведаў, у якіх захоўваюцца і падаюцца з дапамогай датчыка выпадковых лікаў 80 тэставых заданняў. Другі блок гэтага электроннага падручніка — рэсурсы для рэжыму "канструктар" — дазваляе самастойна ствараць слайд-фільмы, тэсты, эсэ, рэфераты.

Карыстаюцца гэтым цудам тэхнікі пакуль пераважна студэнты факультэта па лакальнай камп'ютарнай сетцы. У падшэфнай школе №125 і на курсах павышэння кваліфікацыі, якія курыруе кафедра сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, таксама ведаюць гэты падручнік. Нядаўна гэтае новаўвядзенне прыйшло і ў Полацкі дзяржаўны універсітэт. Форма электроннай прэзентацыі вельмі зручная і для самастойнага вывучэння матэрыялу, і для правядзення лекцый: слухаць аповед выкладчыка — гэта адно, а бачыць прыклады, спрацыраваныя на экран пры дапамозе камп'ютара, на ўласныя вочы — зусім іншае.

Асноўнай праблемай для выкарыстання найноўшых тэхналогій у навучальным працэсе на асобных факультэтах застаецца недастатковая матэрыяльна-тэхнічная база. Але магчымасць карыстацца падрыхтаваным мультымедыйным падручнікам усё ж ёсць: дастаткова накіраваць на гістарычны факультэт адміністрацыйны запыт ад імя дэкана, пасля чаго будзе падпісаны акт укаранення і студэнты змогуць "пагартаць" старонкі нашай гісторыі.

Разглядаючы на маніторы схемы і табліцы, знаёмыя яшчэ са школьных гадоў, я нават пазайздросціла студэнтам-гісторыкам: "Вось ён, падручнік заўтрашняга дня. І нават сённяшняга". Цяпер практычна кожны студэнт мае доступ да камп'ютара, а вось "класічных" друкаваных падручнікаў хапае не ўсім. Да таго ж, нават самую найлепшую кнігу не прымусіш паказваць ці гаварыць.

Цяпер ідзе праца над трэцяй версіяй падручніка. Але працэс гэты вельмі працаёмкі, і таму абноўлены варыянт павінен з'явіцца толькі ў канцы 2005 г. У ім дадасца раздзел "Дзеці вайны", а таксама інфармацыя пра мемарыялы Беларусі, барацьбу партызанаў, падпольшчыкаў, народны рух, аперацыі наступу і вызвалення. Больш шырокае асвятленне атрымае акупацыйны рэжым. Для збору матэрыялу студэнтка Алена Шырко паедзе ў Германію. З'явіцца новы раздзел "Калабаранты", складзены паводле матэрыялаў аднайменнага электроннага падручніка. У "Тэсціраванні" будзе ўведзена абмежаванне часу. А для самых "незахопленых" у новую версію ўвойдзе інструментарый для стварэння красвордаў і мазаікі для складання карцінак.

Гэтая электронная кніга — не адзіны мультымедыйны прадукт гістарычнага факультэта. Пералік такіх распрацовак налічвае 27 назваў прэзентацый, даведнікаў, адукацыйных праектаў. Пра зробленае нашымі гісторыкамі ведаюць у Канадзе, Іспаніі, Расіі, Нідэрландах і інш.

Вядома, новыя інфармацыйныя тэхналогіі ў выкладанні зусім не азначаюць, што ад старых трэба адмовіцца. Ніхто не адмяняў лекцыі, падручнікі, канспекты і вусныя іспыты. Але ў спалучэнні з новымі тэхналогіямі навучанне становіцца лёгкім і цікавым — як гульня.

**Ірына БАЖКО**

## СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ШЛЯХ ДА ЎСЕАГУЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ СЁННЯ ІДЗЕ ПРАЗ БЕЛАРУСЬ

Сёння ўся адукацыйная і навуковая грамадскасць Беларусі і дзяржаваў-удзельніц СНД жыве ў прадчуванні беспрэцэдэнтнай і вельмі значнай падзеі: 5 красавіка ў Мінску пачнецца Міжнародны форум "Адукацыя для ўстойлівага развіцця: на шляху да грамадства ведаў". Гэта маштабнае мерапрыемства, якое на 2 дні збярэ ў нашай сталіцы вядучых навукоўцаў і спецыялістаў, а таксама чыноўнікаў самага высокага рангу ў сферы адукацыі і навукі дзяржаваў Садружнасці, без сумневу, стане заўважнай з'явай не толькі для нашай краіны і СНД, але і для ўсёй адукацыйнай і навуковай эліты. Асаблівасць гэтага форуму ў тым, што праграма яго правядзення ўпершыню ўключае комплекс узаемазвязаных мерапрыемстваў, якія праводзяцца пад эгідай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА), кожнае з якіх само па сабе ўжо з'яўляецца маштабнай падзеяй.

Па-першае, Міжнародны форум — гэта найперш навуковая канферэнцыя, на якой інтэлектуальная эліта прадстаўленых на ёй краінаў абмяркуе і выпрацуе свае рэкамендацыі па найбольш актуальных праблемах сучаснай адукацыі і навукі, а таксама па рэфармаванні нацыянальных сістэм адукацыі ва ўмовах міжнароднай інтэграцыі і глабалізацыі.

Па-другое, разам з навуковай канферэнцыяй 5 і 6 красавіка ў Мінску пройдзе шэраг прымеркаваных да форуму мерапрыемстваў з удзелам афіцыйных прадстаўнікоў ЮНЕСКА, міністэрстваў і арганізацый сістэмы адукацыі краінаў СНД, у тым ліку:

сумеснае пасяджэнне кіраўнікоў ЮНЕСКА і міністраў адукацыі дзяржаваў-удзельніцаў СНД, прысвечанае абмеркаванню перспектываў развіцця

(Заканчэнне на 7-й стар.)

## НАВУКОВЫ ІНТАРЭС

# ДЫЯЛОГ З ПОЛЬШЧАЙ

Факультэт міжнародных адносін нашага універсітэта падтрымлівае шчыльныя сувязі з Еўрапейскім фондам "Дыялог". Так, у лістападзе 2004 г. адбылася канферэнцыя "Беларусь — Польшча: шлях да супрацоўніцтва". Аналагічная канферэнцыя адбудзецца сёлета ў кастрычніку ў польскім Вроцлаве. З 6 па 13 лютага я, як аспірант кафедры міжнародных адносін БДУ, разам з іншымі беларускімі даследчыкамі па запрашэнні фонду праходзіў навуковую стажыроўку ў Рэспубліцы Польшча.

Еўрапейскі фонд "Дыялог" пачаў сваю дзейнасць у 1999 г. Гэта незалежная, некамерцыйная і няўрадавая арганізацыя, штаб-кватэра якой знаходзіцца ў горадзе Быдгашч (Польшча). На пачатку 2001 г. было адчынена Прадстаўніцтва Еўрапейскага фонду "Дыялог" у Беларусі. Офісы фонду працуюць таксама ў Калінінградзе і Кіеве. Статутнымі мэтамі фонду з'яўляюцца спрыянне супрацоўніцтву паміж навуковымі коламі краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, ініцыяванне і ажыццяўленне навукова-даследчых праектаў, якія тычацца праблем развіцця грамадстваў у дзяржавах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, садзейнічанне міжнароднаму навуковаму, культурнаму, адукацыйнаму, эканамічнаму і грамадскаму абмену ў рамках еўрапейскіх інтэграцыйных працэсаў. Фонд арганізуе і фінансуе навуковыя канферэнцыі і семінары, стварае міжнародныя даследчыя групы, фінансуе і арганізуе для маладых навукоўцаў навукова-даследчыя стажыроўкі ў Польшчы і іншых краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, спрыяе выданню навуковай літаратуры, садзейнічае вывучэнню польскай мовы ў расійскім, беларускім і ўкраінскім навуковым асяроддзі, арганізуе азнаямленчыя і даследчыя паездкі.

У рамках навуковай стажыроўкі беларускія даследчыкі працавалі ў бібліятэках і архівах гарадоў Быдгашча і Торуні, праводзілі навуковыя кансультацыі з польскімі даследчыкамі, бралі ўдзел у "круглых сталах" і канферэнцыях. Так, беларуская дэлегацыя наведала Торуньскую дзяржаўную акадэмію, дзе правяла шэраг навуковых кансультацый з гісторыкамі гэтай прэстыжнай навучальнай установы Польшчы. У бібліятэцы інстытута гісторыі гэтай акадэміі беларускія гісторыкі знайшлі цікавую літаратуру, якая спатрэбіцца на радзіме для напісання дыпломных і дысертацыйных работ.

Актыўная даследчыцкая і навуковая праца беларускай дэлегацыі спалучалася з культурнымі мерапрыемствамі. У Быдгашчы мы наведалі Тэатр оперы, які з'яўляецца адным з лепшых у Польшчы, пазнаёміліся з гістарычнымі славутасцямі Торуня, Гданьска і Варшавы. Напрыканцы стажыроўкі давялося ўбачыць зімовае Балтыйскае мора.

**Сяргей ЛАШКЕВІЧ,**
**аспірант кафедры міжнародных адносін БДУ**

## ДА 60-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ

*Ветэраны БДУ ўспамінаюць*

***Усё далей ад нас Вялікая Айчынная вайна. Усё менш сведкаў гэтай трагічнай і адначасова гераічнай эпохі. У спецыяльнай рубрыцы "Беларускага універсітэта" гучаць жывыя галасы гісторыі — тых з супрацоўнікаў БДУ, хто бачыў вайну на свае вочы.***

***Аўтар успамінаў Дзмітрый Сцяпанавіч УМРЭЙКА — Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат прэміі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, акадэмік Беларускай інжынернай акадэміі, член-карэспандэнт Еўрапейскай акадэміі мастацтва, навукі і славеснасці.***

# ДЗЯЦІНСТВА, АПАЛЕНАЕ ВАЙНОЙ



22 чэрвеня 1941 года. Гэты дзень быў па-сапраўднаму летнім: ясным, сонечным, спякотным. На небе ні воблачка, амаль у самым разгары купальны сезон, у тым ліку і на нашай ціхай рачулцы Тур'і, якая пачынала свой шлях у некалькіх кіламетрах ад старой (да 1939 года) савецка-польскай мяжы і праз нейкі дзесятак кіламетраў упадала ў Нёман.

Вёска наша называлася Лавы і размяшчалася на мяжы Капыльскага і Уздзенскага раёнаў Мінскай вобласці за 100 км ад Мінска і 30 км ад найбліжэйшай чыгуначнай станцыі — Негарэлага. Рачулка падзяляла вёску на дзве часткі: асноўны масіў і так званую Палянку, дзе стаяла толькі каля дзесятка дамоў, з трох бакоў аточаных велічнымі хваёвымі і лістоўнымі дрэвамі. На ўскрайку гэтага лесу і знаходзіўся наш маленькі драўляны дамок з гаспадарчымі пабудовамі, садам, гародам і пасекай. Даглядаў пасеку Аляксандр Мікалаевіч Пыліла, а дапамагала яму жонка — мая бабуля Ганулья.

У гэтай ідылічнай абстаноўцы і заспеў мяне першы дзень вайны. Раніца была звычайнай, але з паўдня мы звярнулі ўвагу на частыя палёты самалётаў, прычым у адзін бок — з усходу на захад. Назад яны чамусьці не вярталіся, і гэта ўсіх устрывожыла. Радыё ў вёсцы не было, інфармацыя прыходзіла са спазненнем. Толькі ўвечары да нас дайшлі чуткі, што пачалася вайна. На трэці дзень з'явіліся рэальныя прыкметы баявых дзеянняў: праз нашую вёску пацягнуліся чарадой у адступленне байцы Чырвонай Арміі. Следам з'явіліся варожыя самалёты, якія абстрэльвалі іх.

Самалёты ішлі настолькі нізка, што добра было відаць твары пілотаў у шлемах і акулярах: высунуўшыся з кабіны, яны разглядалі, што робіцца ўнізе. Чырвонаармейцы падалі на зямлю, хаваліся ў жыце, пад дрэвамі, у пабудовах. Страляніны не было, але псіхалагічны эфект быў велізарны. Аднойчы з лесу выскачыла наша танкетка, але за вёскай у яе скончылася паліва, і яна спынілася. Танкісты выйшлі, паглядзелі, махнулі рукой і пайшлі з іншымі салдатамі. Нам, дзецям, потым было вялікае задавальненне забірацца ў яе і паціху раскручваць.

У той самы дзень з Мінска прыехала мая маці і распавяла, што робіцца ў горадзе. Бацька ў першы дзень пайшоў на фронт, горад гарэў, яна двое сутак на спадарожных машынах дабіралася да вёскі. Мы вырашылі эвакуіравацца на ўсход, але ніякага транспарту не было, перадавыя нямецкія часці знаходзіліся недзе блізка, таму ад гэтай думкі адмовіліся.

Нашы часці адступалі, у лесе ўсё больш заставалася кінутай зброі — аж да артылерыйскіх гармат. Пры канцы чэрвеня гэтая плынь стала спыняцца — заставалася чакаць немцаў. Маці ўдалося пехатой схадзіць у Мінск, забраць дакументы, нейкія рэчы і вярнуцца назад. У Мінску яе наведалі бацькавы таварышы па службе. Відавочна, яны пра нешта дамовіліся, бо адзін з іх пазней з'явіўся ў нас дома — Міхаіл Мікалаевіч Ізюмскі, які раней добра ведаў бацьку. Маці аддала госцю бацькава скуранае паліто, нешта з рэчаў і пра штосьці дамовілася з ім. Як мне стала потым вядома, у нашым доме была арганізавана адна з явак будучага партызанскага злучэння. Гэты візіт бачыў той-сёй з нашых адначасковцаў, але, на шчасце, за ўсю вайну ў нашай вёсцы не было ніводнага здрадніка.

На пачатку ліпеня праз нашую вёску прайшла першая нямецкая вайсковая часць. Пабачылі мы немцаў, калі іх калона выйшла з лесу. Нам з сябрамі не было куды падацца, таму мы схаваліся за плотам у кустах.

Дзейнасць першага партызанскага атрада (каля 20 чалавек) мы адчулі ўжо ў жніўні 1941-га. Немцам трэба было ўзмацніць мост праз нашую рачулку, і яны кожны дзень на працягу тыдня прыводзілі групу рамонтнікаў з суседняй вёскі. Раніцай яны прыходзілі, увечары сыходзілі. Дарога ішла праз лес, і ў адзін з вечароў мы пачулі частую страляніну за лесам. Выявілася, што партызаны наладзілі засаду і, калі немцы вярталіся дадому, адкрылі па іх агонь: некалькіх чалавек забілі і паранілі, астатнія каля моста больш не паказваліся.

Другое з'яўленне ў нашым доме партызанскага сувязнога адбывалася пры поўным захаванні канспірацыі: мяне адправілі пастаяць "на шухеры", паслухаць, хто пра што гаворыць, ці няма ахвотных папрацаваць на немцаў. Адначасова мне даручалі стварыць групу хлопцаў для збору ў лесе зброі і боепрыпасаў.

Першае баявое хрышчэнне мне давялося атрымаць улетку 1942-га. Пасвячы статак кароў, я павінен быў праверыць стан нашага зброевага склада. Ці выпадкова, ці з нечай падачы ў небе з'явіліся дзве нямецкія "рамы" і пачалі бамбёжку. Скінуўшы бомбы, яны зляцелі, а мяне сур'ёзна кантузіла, засыпала зямлёй. На шчасце, гэта было недалёка ад вёскі. Прыбегла маці, адкапала мяне. Статак кароў, як і склад зброі, засталіся цэлымі.

Найбольш моцнае ўражанне ў мяне захавалася ад падзей канца 1942 г. Напярэдадні 25-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі зранку мы пачулі гукі бою, які адбываўся ў Старыцкім лесе. Ён ішоў увесь дзень і сціх толькі пад вечар. На світанку наступнага дня калона партызанаў падышла да нашай вёскі. Змучаныя, стомленыя, з вялікай колькасцю параненых, яны зайшлі ў нашую хатку і пападалі — хто на ложак, хто на лаўку, а хто і проста на падлогу. Не памінула і паўгадзіны, як у дом літаральна ўляцеў начальнік, за адно імгненне падняў усіх на ногі і павёў у лес. Выявілася, што гэта быў славуты камандзір партызанскага злучэння, пазней генерал-маёр Піліп Піліпавіч Капуста (тады — Фёдар Фёдаравіч Бажэнка). Перадыслакаваўшыся са Старыцкага ў Лаўскі лес, партызаны хутка ўладкаваліся і штодзень (дакладней штоночы) выязджалі на баявыя заданні. За паўтара месяца ў Лаўскім лесе ўдалося падлекаваць усіх параненых, у чым вялікая заслуга начальніка шпіталя Міхаіла Майсеевіча Герасіменкі (пасля вайны ён доўгі час узначальваў Уздзенскую раённую бальніцу). За гэты час у нашай хатцы прайшло некалькі сустрэч партыйнага, савецкага і ваеннага кіраўніцтва Мінскай вобласці на чале з І.Д. Варвашэнем. Мая роля ў гэтых мерапрыемствах была ў тым, каб, знаходзячыся ў вёсцы, глядзець і слухаць, ці няма якой інфармацыі пра тыя нарады.

Рашэннем Беларускага штаба партызанскага руху ў Маскве і ўказаннем асабіста яго нага начальніка П.З. Калініна нам было загадана эвакуіравацца на адным з авіяцыйных рэйсаў. Аднак пры гэтым перастаў бы існаваць пункт сувязі. Таму па просьбе мясцовых кіраўнікоў мы не скарысталіся гэтай прапановай і да канца вайны выконвалі функцыю сувязных пры атрадзе С.М. Будзённага (камандзір М.М. Ізюмскі, камісар М.Г. Янкоўскі, начальнік штаба В.Г. Забудзька) брыгады імя М.В. Фрунзе № 95.

**Ад рэдакцыі:**
**Выказваем удзячнасць за матэрыял, прадастаўлены ў рэдакцыю, Альберту Іосіфавічу КОТАВУ, старшыні Савета ветэранаў гістарычнага факультэта БДУ, адказнаму сакратару Рэспубліканскай камісіі па патрыятычным выхаванні моладзі і міжнародных сувязях Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў Рэспублікі Беларусь.**

## З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# СТУДЭНЦКАЯ ПАЛІКЛІНІКА ТОЛЬКІ ДЛЯ ІНШАГАРОДНІХ

***Студэнтаў-мінчан цяпер будуць абслугоўваць толькі ў паліклініках па месцы жыхарства. Раённыя паліклінікі возьмуць на сябе нават рашэнне пытанняў наконт прадастаўлення акадэмічных адпускоў, дыспансерызацыі хранічных хворых і інвалідаў.***

Аднак некаторыя паслугі для мінчан у 33-й паліклініцы ўсё ж захаваліся: медыцынскі агляд першакурснікаў з вызначэннем групы па фізкультуры, агляд для праходжання вытворчай практыкі, афармленне дакументаў для працы ў аздараўленчых лагерах, а таксама за мяжой. Кожны студэнт-мінчанін па-ранейшаму мае права праходзіць тут флюараграфічнае абследаванне і рабіць прафілактычныя прышчэпкі.

Чаму і як было прынята такое рашэнне? Змены адбыліся на падставе загаду камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама. Па словах галоўнага ўрача 33-й паліклінікі А.Р. Харковай, за апошнія 2 гады колькасць студэнтаў, якія абслугоўваюцца тут, павялічылася на 16.614 чалавек. Гэта выклікана з'яўленнем новых спецыяльнасцей на факультэтах, павелічэннем набору першакурснікаў, а таксама ўдзельнай вагі іншагародніх студэнтаў. Паліклініка разлічана на 850 наведванняў за змену, у той час як рэальная лічба складала 1020 наведванняў. Як вынік, знізілася даступнасць аказання медыцынскай дапамогі. Спадзеючыся вырашыць гэту праблему, кіраўніцтва студэнцкай паліклінікі неаднаразова звярталася ў камітэт па ахове здароўя. Але просьба была задаволена толькі на пачатку гэтага года. Гэтыя звароты ледзь не абярнуліся для паліклінікі расфарміраваннем: узнікла прапанова не толькі перавесці мінчан на абслугоўванне ў раённых паліклініках, але і стварыць замест паліклінікі пункты аховы здароўя пры інтэрнатах. Але ж здаровы сэнс перамог, бо ў 33-й паліклініцы ёсць штат кваліфікаваных і вопытных спецыялістаў вузкага профілю. Таму рашэнне пра скасаванне адзінай у горадзе студэнцкай паліклінікі прызналі памылковым.

У распараджэнне раённых паліклінік ужо перададзены медыцынскія карты дыспансерных хворых, якім неабходны пастаянны нагляд. Астатнія ж пакінулі ў разліку на тое, што студэнты могуць паехаць працаваць за мяжу або ў будатрад, і тады яны абавязкова звернуцца ў 33-ю паліклініку. Пры неабходнасці кожны з іх можа напісаць заяву і забраць сваю картку.

**Ала МАЧАЛАВА**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
31 сакавіка 2005 года, № 7 (1915)

## СУПРАЦОЎНІЦТВА

### ТЫДЗЕНЬ ШВЕЦЫІ

У рамках Тыдня Швецыі і шведскай мовы на факультэце міжнародных адносін нашага універсітэта 14—18 сакавіка адбыўся шэраг мерапрыемстваў. Былі паказаныя фільмы "Ondskan", "Syndare i sommarsolen" і "Miffo" на шведскай мове, кіраўнік аддзялення шведскага пасольства ў Мінску Ян Шадэк правёў прэзентацыю "Дыпламатыя пашведску", супрацоўніца пасольства Швецыі ў Маскве Крысціна Ёханэсан правяла для студэнтаў семінары "Асновы перакладу", "Пераклад — практычныя заняткі". Хэлена Эрыксан правяла семінар для выкладчыкаў шведскай мовы, а лектар Шведскага інстытута Мортэн Франкбю зладзіў прэзентацыю "Інтэрнацыяналізацыя шведскай культуры". На працягу ўсяго Тыдня Швецыі і шведскай мовы на базе факультэта міжнародных адносін працавала інфармацыйная выстава.

Акрамя таго, у памяшканні фундаментальнай бібліятэкі БДУ (галоўны корпус, 2-і паверх) да 5 красавіка працуе мінівыстава "Швецыя і шведы". На ёй кожны можа пазнаёміцца з інтэрактыўнай прэзентацыяй, прысвечанай Швецыі і шведскай культуры, а таксама з кнігамі і буклетамі, якія адлюстроўваюць розныя сферы жыцця гэтай краіны і магчымасці навучання ў ВНУ Швецыі. Матэрыялы для выставы прадаставіла Пасольства Швецыі ў Расіі.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення па міжнародных сувязях**

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

### СПЯВАЙ ЗВАНЧЭЙ!

25 сакавіка для ўдзельнікаў конкурсу эстраднай песні "Залатыя галасы" прайшло пад дэвізам "Спявай званчэй і грамчэй — атрымаеш прыз танней!" Конкурс праводзіўся па ініцыятыве аддзела культуры адміністрацыі Маскоўскага раёна сталіцы і БДУ. Удзел у ім прымалі школьнікі, навучэнцы сярэдне-спецыяльных устаноў, ВНУ, а таксама працоўная моладзь. Журы звяртала ўвагу не толькі на вакальныя здольнасці выканаўцаў, але і на іх артыстычнасць і якасць музычнага суправаджэння.

Журы ўзнагароджвала як лаўрэатаў I, II і III ступеняў, так і пераможцаў у намінацыях "Лепшая песня", "Артыстычнасць", "Аўтарская песня", "Прыз сімпатый гледачоў". Таленавітая моладзь атрымала дыпломы і каштоўныя падарункі: кветкі, цікавыя кнігі, фотаапараты, прыгожыя вазы і сервізы. Сярод удзельнікаў з БДУ вызначылася Юлія Трыпуцька, якая з песняй "Je t'aime" заняла другое месца сярод канкурсантаў старэйшай групы.

**Алёна КРЫЎКІНА**

## ПОМНІКІ БДУ

# БЕЛАРУСКІ АДРАДЖЭНЕЦ

Немагчыма пачынаць размову пра чалавека эпохі Адраджэння, не ўцямі́ўшы сутнасці самога Рэнесансу.

XV і XVI стагоддзі былі часам вялікіх пераменаў у эканоміцы, палітычным і культурным жыцці еўрапейскіх краін. Хуткі рост гарадоў і развіццё рамёстваў, а пазней і зараджэнне мануфактурнай вытворчасці, уздым сусветнага гандлю, што ўцягваў у сваю арбіту ўсё больш аддаленыя раёны, паступовае перамяшчэнне галоўных гандлёвых шляхоў з Міжземнамор'я на поўнач, якое сконччылася пасля падзення Візантыі і эпохі Вялікіх геаграфічных адкрыццяў канца XV і пачатку XVI стст., пераатварылі аблічча сярэднявечнай Еўропы. Амаль паўсюдна на першы план сталі высоўвацца гарады. Некалі магутныя сілы сярэднявечнага свету — імперыя і папства — перажывалі крызіс. Ва ўсіх галінах жыцця адбываўся працэс вызвалення ад сярэднявечных забаронаў. Усе перамены ў жыцці грамадства суправаджаліся шырокім абнаўленнем культуры — росквітам прыродазнаўчых і дакладных навук, літаратуры і выяўленчага мастацтва. З'явіўшыся ў гарадах Італіі, гэтае абнаўленне захапіла потым і іншыя еўрапейскія краіны. Кнігадрукаванне адкрыла нябачаныя магчымасці для распаўсюджвання літаратурных і навуковых твораў, а больш рэгулярныя і шчыльныя зносіны паміж краінамі спрыялі паўсюднаму пранікненню новых павеваў.



Тэрмін "Адраджэнне" з'явіўся ў XVI ст. Гэтае паняцце ўзнікла на аснове шырока распаўсюджанай у той час гістарычнай канцэпцыі, згодна з якой эпоха Сярэднявечча была перыядам цемрашальскага варварства і неадукаванасці, якія наступілі пасля гібелі бліскучай антычнай цывілізацыі. Мастацтва, якое некалі квітнела ў антычным свеце, у гэты час адраджалася да новага жыцця. Падкрэсліваючы цікаўнасць да чалавечага насуперак боскаму, прадстаўнікі новай свецкай інтэлігенцыі называлі сябе гуманістамі — ад Цыцэронаўскага паняцця "studia humanitanis", што азначала вывучэнне ўсяго, звязанага з прыродай чалавека і яго духоўным светам. Для эстэтычных трактатаў і твораў мастацтва Адраджэння характэрна бачанне чалавека як адзінства разумовага і пачуццёвага, свабоднай істоты з бязмежнымі творчымі магчымасцямі.

Эстэтыка Адраджэння арыентуе мастацтва на пераймание прыроды. Аднак на першым месцы тут не столькі прырода, колькі мастак, які ў сваёй творчай дзейнасці прыпадабняецца да Бога.

Мікола Гусоўскі — беларускі паэт-гуманіст, прадстаўнік новалацінскай паэзіі эпохі Адраджэння. З яго імем звязана нараджэнне рэнесансна-рэалістычнай традыцыі ў беларускай і польскай літаратурах тых часоў.

Сын княскага лоўчага, ён нарадзіўся на тэрыторыі Падняпроўя ці Наднямоння. Вырас у часы так званага "Залатога веку". Каталікі і праваслаўныя Вялікага княства Літоўскага мелі роўныя правы і не канфліктавалі з веравызнаўчых прычынаў. Адраджэнне XVI стагоддзя дало прадстаўнікам розных саслоўяў магчымасць атрымаць добрую адукацыю. Такую магчымасць меў і Гусоўскі. Першапачаткова ён вучыўся на Беларусі, а як сын княскага паляўнічага выпрабаваў небяспечныя прыгоды у лясах Белавежскай пушчы. Пазней паэт адправіўся вучыцца ў Вільню, Польшчу ды Італію.

Віленскі, Кракаўскі, Балонскі універсітэты, Сарбона дасягнулі найвышэйшага росквіту ў Еўропе. З часоў Рэнесансу ў Балонскі універсітэт цягнуліся студэнты не толькі з усіх краёў Італіі, але і з усёй Еўропы. Гэта была адна з першых у свеце інтэрнацыянальных навучальных установаў. Італьянцы і замежнікі вучыліся на розных аддзяленнях: мясцовыя грамадзяне ў Cismontanes (тыя, што жывуць перад гарой), замежнікі — у Ultramontanes (тыя, што жывуць за гарой). У другім падраздзяленні былі групы для 18 розных "нацыянальнасцяў". (Дарэчы, французаў як адной нацыі тады яшчэ не было: ва універсітэце вучыліся нармандцы, бургундцы, брэтонцы і гасконцы.) У розныя гады тут вучыліся Тарквата Тасо, Карла Гальдоні, Альберт Дзюрэр. Парацэльс стаўў там доследы падчас сваіх вандровак. Мікалай Капернік казаў следчым, што ератычная думка пра кручэнне Зямлі прыйшла яму на розум 9 сакавіка 1497 г., калі ён навучаўся ў Балонскім універсітэце. Дый сённяшні Балонскі працэс названы якраз паводле гэтай навучальнай установы.

Студэнты тых часоў вялі "вандроўны лад жыцця", слухаючы лекцыі то ў Сарбоне, то ў Кракаве, то дзе яшчэ: тагачасныя універсітэты былі адукацыйнымі цэнтрамі Еўропы. Дзякуючы свабодзе выказвання думак і сувязі паміж навуковымі цэнтрамі выкладчыкі і студэнты тых часоў мелі магчымасць дзяліцца сваімі поглядамі, вынаходзіць новыя тэорыі і спрачацца наконт існуючых. Так нараджаўся новы светапогляд моладзі, якая імкнулася думаць па-новаму, жыць па-новаму. Пасля доўгіх вандровак і вучобы яны вярталіся дадому і актыўна распаўсюджвалі гуманістычны светапогляд і новы лад жыцця, працягвалі пісаць, рабіць новыя адкрыцці на радзіме.

У 20-я гады XVI стагоддзя разам з епіскапам Эразмам у складзе польска-літоўскай дыпламатычнай місіі Гусоўскі вяртаецца ў Італію, у Рым, дзе дыпламаты меркавалі дамовіцца з Рымскім Папам Львом X пра стварэнне кааліцыі хрысціянскіх дзяржаў супраць турак і татар, якія пагражалі ВКЛ.

Аднойчы пасля агляду бою быкоў у Рыме Гусоўскі распавёў пра паляванне на зуброў, у якім юнаком удзельнічаў сам. Відаць, ён аказаўся адмысловым апавядальнікам, таму што епіскап Эразм прапанаваў свайму падначаленаму апісаць паляванне на зубра. Верагодна, замаўляючы Гусоўскаму паэму як дадатак да падарунка Папу Льву X, які пажадаў мець чучала звера, епіскап не чакаў такога запалу з боку падначаленага. Паэт пайшоў значна далей простага апісання палявання і ў сваім творы даў карціну прыроды, заняткаў, звычаяў і вераванняў цэлага народа. Дзякуючы свайму таленту і пяру, Гусоўскі ўславіў сваю радзіму і яе людзей. У свецкім творы высокага стылю ён распавядае пра краіну, яе жыхароў, параўноўвае князя Вітаўта з зубрам. Упершыню ў літаратурным творы закранаецца тэма аховы прыроды і яе багацццяў, аўтар не хавае сваіх пачуццяў: паэма прасякнута любоўю да роднага краю, царом лясоў і пушчаў якога з'яўляецца зубр — самы магутны са звяроў, якога прырода захавала менавіта на Беларусі. Князь Вітаўт параўноўваецца з зубром, які жыве ў гармоніі з навакольным светам. У час княжання Вітаўта ВКЛ дасягнула найбольшага росквіту. Аўтар лічыць яго здабыткі для радзімы неацэннымі.

Цяпер такога дзеяча, як Гусоўскі, магчыма, назвалі б "чалавекам, які сам сябе зрабіў". Дзякуючы падарожжу ў Еўропу, ён назіраў за працэсамі перабудовы ў грамадстве, бачыў, як людзі пачалі задумвацца пра сваё жыццё, яго сэнс. Чалавек апынуўся ў цэнтры Сусвету і цывілізацыі. Адраджаліся грэчаскі і рымскі погляды на жыццё, творчасць, філасофію, імкненне растлумачыць паходжанне чалавецтва і сутнасць зямнога існавання. Мікола Гусоўскі здолеў таленавіта і яскрава выказаць у творы свой рэалістычны погляд на чалавека, грамадзяніна, яго лад жыцця, навакольны свет.

Складаючы "Песню пра выгляд, лютасць зубра і паляванне на яго", ён не забываў асноўную мэту пасольства ў Рыме: дамагчыся стварэння кааліцыі супраць захопнікаў. Гусоўскі смела выступае супраць абыякавасці папскага акружэння да бедстваў і гора людзей. Гуманізм выяўляецца ў апецы над людзьмі, якія даваяраюць сваё жыццё духоўным айцам. Лёс кожнага чалавека для Гусоўскага-адраджэнца мае значэнне.



У яго творы пераплятаюцца вобразы зубра, князя і народа. Аўтар заклікае славянскія народы аб'яднацца, каб спыніць турэцкую агрэсію. У радках паэмы выявіўся рэнесансавы, эстэтычны ідэал паэта з яго верай у дзейнага, гарманічна развітага, духоўна і фізічна дасканалага чалавека.

У 1522 годзе ў Рыме пачалася эпідэмія чумы. Многія саноўнікі збеглі з горада, і звар'яцелыя ад жаху жыхары ішлі за ўсялякімі цудадзеямі, якія абяцалі пазбавіць іх ад пакут. Адны жыхары вымушана зачыняліся ў дамах, каб не сустрэцца з хворымі, іншыя хавалі сваіх захварэлых на чуму сваякоў ад гарадской аховы. Гусоўскі не толькі быў сведкам няшчасця, ён і сам быў у небяспецы, таму ў адным з вершаў ён звяртаецца да святога Себасцьяна з просьбай дазволіць яму і яго сябрам вярнуцца здаровымі на радзіму. Гусоўскі заклікае Папу Адрыяна VI вярнуцца ў Рым. Паэт у роспачы і непакоі: кіраўнік хрысціянскай царквы, намеснік Бога на зямлі пакідае сваіх вернікаў, калі іх спаткала чума і пагражаюць турэцкія захопнікі. Жах перад хваробай і боязь духавенства ў жудаснай сітуацыі — усё гэта са спачуваннем да пацярпелых рэалістычна апісвае паэт. І не проста занатоўвае свае думкі, але шукае выйсця з гэтага страшнага становішча ў Рыме, імкнецца дапамагчы.

Пасля смерці ў Рыме ад чумы свайго заступніка епіскапа Эразма паэт звяртаецца да італьянскага навукоўца Карла Антоніё з просьбай прадставіць яго паэму "Песня пра выгляд, лютасць зубра і паляванне на яго" сакратару італьянскай каралевы Боны Альфію. Яго твор быў выдадзены, і Мікола Гусоўскі вярнуўся ў Кракаў.

Гусоўскі быў сучаснікам вялікіх і страшных падзеяў. Як чалавек сваёй эпохі, ён працаваў дзеля ідэі, якая была вышэй за яго ўласнае жыццё — ідэі міру і чалавечнасці, здольныя весці за сабой толькі сапраўдных патрыётаў. Ён быў творцам і прынёс ідэі гуманізму на нашу зямлю.

Да канца жыцця ён заставаўся ў Кракаве, дзе дажываў свой век у адзіноце, забыты каралеўскім дваром, разбіты паралюшам, але не зломлены духам.

Яго бессмяротныя думкі, расказ пра лёс чалавека і цэлага народа знайшлі слухачоў праз стагоддзі. Па-сапраўднаму прызнаны і ўшанаваны паэт стаў намнога пазней — у XX стагоддзі. У сувязі з 500-годдзем з дня нараджэння асветніка, якое адзначалася ў 1980 годзе, яго імя ЮНЕСКА ўнесла ў каляндар памятных міжнародных дат, а ў Мінску яго імем была названа вуліца.

Помнік Міколу Гусоўскаму стаіць у дворыку нашага універсітэта. На першы позірк, гэта простая фігура з металу. Фігура чалавека, які заглыбіўся ў свае думкі. Цвёрды духам чалавек, цяпер ён зроблены з каванай медзі на бетонным каркасе. Магчыма, іншага матэрыялу і выдумаць было цяжка для ўвасаблення такога вялікага і моцнага духам асветніка XVI стагоддзя, сапраўднага беларускага зубра.

**Юлія ПІМЕНАВА, Кацярына ЯКУШ**
**Фотаздымкі Юліі ПАПОВАЙ**

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# ДЗЕНЬ РАЎНАДЗЕНСТВА — ДЗЕНЬ ГЕАФАКА

***21 сакавіка — дзень веснавога раўнадзенства, калі дзень роўны ночы. Пасля гэтага дня сонца ўсё вышэй і вышэй падымаецца над гарызонтам, і светлавы дзень становіцца даўжэйшым. Пасля працяглай зімы так радасна сустракаць першыя промні сонца і ведаць, что яно будзе свяціць яшчэ ярчэй. Таму менавіта гэты дзень быў выбраны на геаграфічным факультэце для правядзення Дня геафака.***

Гэтае свята мае сваю гісторыю. На працягу многіх гадоў яго ініцыятарамі былі студэнты, і свята звычайна адбывалася на прыродзе. Паводле прапановы дэкана нашага факультэта Івана Іванавіча Пірожніка, з 1999—2000 навучальнага года яно было прысвечана выдатнікам. На кожным факультэце праводзяцца такія спецыялізаваныя святы — Дзень фізіка, Дзень хіміка і інш. Таму ў мінулым годзе было вырашана аб'яднаць Дзень выдатніка з Днём геафака і адзначаць яго 21 сакавіка.

Сёлета свята ўключала разнастайныя конкурсы, урачысты сход студэнтаў і выкладчыкаў, прысвечаны Дню геафака, канцэрт, урачыстыя мерапрыемствы на кафедрах. На святочным сходзе дэкан факультэта зазначыў, што да 70-гадовага юбілею факультэт прыйшоў з выдатнымі поспехамі: каля 90 студэнтаў (а значыць, кожны восьмы) — выдатнікі. Паводле рашэння рэктарата, усе яны атрымаюць прэміі. Імёны пяці студэнтаў будуць размешчаны на Дошцы выдатнікаў БДУ: М. Мандрык, А. Каробкін, В. Бардашэвіч, С. Русецкі, А. Жэшка. У агульнауніверсітэцкай спартакіядзе геаграфічны факультэт заняў першае месца. У фестывалі эстрады сёлета факультэт меў самае вялікае прадстаўніцтва: з 16 удзельнікаў 5 выйшлі ў фінал, а 3 атрымалі дыпломы. За выдатную вучобу, поспехі ў студэнцкай навуковай рабоце і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці факультэта спецыяльныя граматы Вучонага савета атрымалі студэнты С. Сарокін, М. Кабылінскі, Я. Календа, С. Войтка, Г. Пархімовіч, Я. Казлоў, С. Грымус.

Студэнтаў павіншаваў старшыня Беларускага геаграфічнага таварыства (БГТ) Пётр Сцяпанавіч Лопух. Былі ўрачыста прынятыя ў члены таварыства студэнты В. Дзянісава, М. Кабылінскі, В. Бардашэвіч, Я. Казлоў, В. Александровіч. Частку сваёй багатай бібліятэкі БГТ падарыла фундаментальнай бібліятэцы БДУ.

Спецыяльна да Дня геафака аддзел рэдкай і каштоўнай кнігі універсітэцкай бібліятэкі падрыхтаваў прэзентацыю літаратуры па геаграфічных навуках. Выстава "Геаграфічнае пазнанне свету" была прадстаўлена загадчыцай аддзела Ірынай Ягораўнай Мітрохінай.

Пасля афіцыйнай часткі адбыўся святочны канцэрт, цудоўнай фінальнай кропкай у якім стала яскравае выступленне каманды КВЗ "Радыё БДУ". Потым урачыстае віншаванне выдатнікаў працягнулася ў неафіцыйнай сяброўскай атмасферы на кафедрах.

Дзякуючы такім прыемным момантам у душы нават у будні застаецца надзея на заўтрашні дзень, упэўненасць у сваіх сілах, гатоўнасць да цяжкой працы і проста цёплае пачуццё любові да геафака.

**Людміла ГРЭСЬ,**
**Юлія БОГДАН,**
**студэнткі геаграфічнага факультэта**

## СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ШЛЯХ ДА ЎСЕАГУЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ СЁННЯ ІДЗЕ ПРАЗ БЕЛАРУСЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 4-й стар.)*

ўзаемадзеяння інстытутаў СНД і ЮНЕСКА ў сферы адукацыі і вырашэнню задач, абазначаных ААН у якасці прыярытэтных на бягучае стагоддзе;

Х канферэнцыя міністраў адукацыі дзяржаваў-удзельніцаў СНД, на якой чыноўнікі ад адукацыі самага высокага рангу абмяркуюць пытанні і прымуць рашэнні, звязаныя з працягам фарміравання адзінай (агульнай) навукова-адукацыйнай прасторы ў рамках прадстаўленых імі краінаў і практычнай рэалізацыяй у сваіх краінах прыярытэтных задачаў і ідэалаў ЮНЕСКА з улікам канкрэтных рэкамендацый Міжнароднага форуму;

XVII пасяджэнне Савета па супрацоўніцтве ў сферы адукацыі дзяржаваў-удзельніцаў СНД, дзе яго члены падвядуць вынікі дзейнасці прадстаўленага імі інстытута і выпрацуюць праграму сумесных дзеянняў на бліжэйшую перспектыву.

Неабходна адзначыць, што ўсе гэтыя нібыта лакальныя (якія адносяцца да рэгіёна СНД) і, калі меркаваць па нумарацыі, у нечым шараговыя мерапрыемствы насамрэч дзякуючы ініцыятыве ЮНЕСКА непасрэдна звязаны з вырашэннем вельмі злабадзённых і, без перабольшання, глабальных праблем усёй нашай цывілізацыі.

Сусветная супольнасць апошнім часам сутыкнулася з цэлым комплексам супярэчнасцяў, якія пагражаюць не толькі развіццю, але і самому яго існаванню. У ліку гэтых супярэчнасцяў не толькі энергетычная, сыравінная і экалагічная праблемы, не толькі разбуральная сіла зброі і іншых тэхнагенных фактараў "прагрэсу", якія ўзраслі да незвычайнага ўзроўню, але і проста надзвычайная эканамічная няроўнасць (беднасць) як асобных людзей, так і цэлых народаў, краінаў і нават кантынентаў. Не выпадкова ААН у сваіх справаздачах аб развіцці чалавецтва настойліва звяртае ўвагу сусветнай супольнасці на тое, што сёння каля 2,8 млрд жыхароў планеты, маючы дзённы даход менш за 2 долары ў дзень, элементарна галадаюць, прычым 1,1 млрд людзей задавальняюцца ўдвая меншым заробкам. Усё гэта адбываецца на фоне таго, што ў асобных краінах з ліку так званага "залатога мільярда" сярэднестатыстычны жыхар аналагічную суму штодзённа выдаткоўвае толькі на карэкцыю фігуры.

Ясна, што абуральная беднасць цэлых рэгіёнаў планеты не толькі стварае ідэальныя ўмовы для эпідэмій незлічоных хваробаў душы і цела сучаснага чалавека (СНІД, наркаманія, гандаль рабамі, прастытуцыя, сацыяльная апатыя і агрэсія, дэградацыя насельніцтва, суіцыд і інш.), але і служыць спрыяльным асяроддзем для росквіту тэрарызму, які, верагодна, у значнай частцы насельніцтва зямнога шара асацыіруецца з актыўнай формай пратэсту супраць відавочнай несправядлівасці, абумоўленай гэтай сацыяльна-эканамічнай няроўнасцю. Менавіта таму ААН у сваёй Дэкларацыі тысячагоддзя ад 8 верасня 2000 г. сярод найважнейшых арыенціраў устойлівага развіцця цывілізацыі ў якасці галоўнага з іх абазначыла скарачэнне і знішчэнне беднасці ва ўсім свеце, зрабіўшы асноўны ўпор на дасягненні ўсеагульнай пісьменнасці і доступу да якаснай адукацыі.

І насамрэч, сёння не проста пісьменны, але толькі добра адукаваны чалавек здольны зразумець сапраўдныя, надзейна схаваныя ад погляду простага абывацеля, глыбінныя прычыны беднасці і эканамічнай няроўнасці як асобных людзей, так і цэлых краінаў, рэгіёнаў і кантынентаў планеты. Таму Генеральны сакратар ААН Кофі Анан аўтарытэтна сцвярджае, што ў сучасным свеце "адукаванасць — неабходная ўмова здаровага, справядлівага і паспяховага свету. Адукаванасць — ключ, які адчыняе клетку чалавечых пакутаў, ключ да раскрыцця патэнцыялу кожнага чалавека, ключ да адкрыцця будучыні, волі і надзеі" а той "факт, што 20 % дарослых ва ўсім свеце пазбаўленыя пісьменнасці, — ганьба для ўсіх нас".

Сёння стала відавочным, што знішчэнне беднасці праз усеагульную пісьменнасць і адукацыю — не толькі актуальная і высакародная, але і неверагодна маштабная і складаная задача, бо, нягледзячы на вельмі энергічныя і паслядоўныя намаганні, зробленыя ААН для яе вырашэння, дасягнутыя поспехі вельмі сціплыя. Так, ніводная з канкрэтных мэтаў, абвешчаных Сусветнай канферэнцыяй па пытаннях адукацыі (г. Джамт'ен, Тailand, 5—9 сакавіка 1990 г.) у рамках разлічанай на 10 гадоў праграмы "Адукацыя для ўсіх — 2000", да канца праграмнага перыяду не была цалкам дасягнута, у тым ліку засталася нявырашанай і яе асноўная задача — забеспячэнне ўсеагульнага доступу да базавай адукацыі да 2000 г. Характарызуючы вынікі першага дзесяцігоддзя рэалізацыі праграмы, Генеральны дырэктар ЮНЕСКА Каіціра Мацуура шчыра сказаў, што "намаганні, накіраваныя на распаўсюджванне пісьменнасці, не новыя, але скандал, звязаны з наяўнасцю 860 мільёнаў непісьменных людзей у сённяшнім свеце, з'яўляецца і страшным абвінаваўчым актам, і тэрміновым заклікам да прыняцця больш сур'ёзных абавязкаў... Гэта недапушчальная сітуацыя".

Лагічна, што сумесныя дзеянні па выкараненні непісьменнасці ў рамках праграмы "Адукацыя для ўсіх" было вырашана працягнуць на Сусветным форуме па пытаннях адукацыі (г. Дакар, Сенегал, 26—27 красавіка 2000 г.), які ўхваліў так званыя "Дакарскія рамкі дзеянняў", якія ўпершыню дакладна звязалі праблемы адукацыі з устойлівым развіццём. У прыватнасці, у гэтым дакуменце адзначаецца, што адукацыя мае "ключавое значэнне для ўстойлівага развіцця, міру і стабільнасці як унутры краінаў, так і між краінаў і тым самым з'яўляецца незаменным сродкам эфектыўнага ўдзелу ў жыцці грамадскіх і эканамічных структураў у XXI ст." Дакарскія рамкі вызначылі 6 галоўных прыярытэтаў рэалізацыі праграмы "Адукацыя для ўсіх" да 2015 г., у ліку якіх: пашырэнне адукацыі для дзяцей у раннім узросце, забеспячэнне вольнага і абавязковага доступу ўсіх дзяцей да пачатковай (базавай) адукацыі, гарантаваны доступ да функцыянальнай адукацыі моладзі і дарослых па праграмах навучання асноўным жыццёвым навыкам, павышэнне на 50 % узроўню пісьменнасці дарослага насельніцтва планеты, забеспячэнне роўнасці пры атрыманні адукацыі, павышэнне якасці адукацыі.

Для выканання вызначаных Сусветным форумам у Дакары прыярытэтных задач ААН абвясціла 2003—2012 гады Дзесяцігоддзем пісьменнасці, умоўна падзяліўшы яго на 5 двухгадовых перыядаў, кожны з якіх прысвячаецца вырашэнню канкрэтнай праблемы. Так, 2003—2004 гг. прайшлі пад дэвізам "Пісьменнасць і пол" і былі звязаныя з вырашэннем праблемы выкаранення няроўнасці палоў пры атрыманні адукацыі. Цяперашнія 2005—2006 гг. праходзяць пад дэвізам "Пісьменнасць і ўстойлівае развіццё". У перспектыве ЮНЕСКА, якой ААН адвяла спецыяльную ролю ў рэалізацыі Дзесяцігоддзя пісьменнасці, аж да 2012 г. будзе актыўна працаваць і ў іншых аналагічных кірунках: "Пісьменнасць і здароўе", "Пісьменнасць і сацыяльны ўзровень" і "Пісьменнасць і мір".

Гэты гістарычны экскурс сведчыць, што арганізаваны ў Мінску Міжнародны форум "Адукацыя для ўстойлівага развіцця: на шляху да грамадства ведаў", па-першае, з'яўляецца важным і цалкам канкрэтным этапам рэалізацыі Дзесяцігоддзя пісьменнасці ў рамках яго двухгадовага перыяду "Пісьменнасць і ўстойлівае развіццё". Па-другое, гэтае мерапрыемства — неад'емная складовая частка глабальнай дзейнасці ААН па выкананні абазначаных у Джамт'ене і Дакары задачаў, звязаных з рэалізацыяй фундаментальных і сапраўды высакародных прынцыпаў "адукацыя для ўстойлівага развіцця" і "адукацыя для ўсіх".

Хочацца верыць, што намаганні па арганізацыі і падрыхтоўцы форуму, якія робяць сёння Маскоўскае бюро ЮНЕСКА, Выканаўчы камітэт СНД, Савет па супрацоўніцтве ў галіне адукацыі дзяржаваў-удзельніцаў СНД, урад Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Беларускі дзяржаўны універсітэт, дазволяць кансалідаваць сілы для вырашэння праблем, актуальных не толькі для нашых краінаў, але і для ўсяго свету. А той факт, што менавіта Мінск абраны ЮНЕСКА ў якасці месца правядзення такога адказнага мерапрыемства, якое з'яўляецца часткай цэлага ланцуга ўзаемазвязаных інцыятываў ААН па гарманізацыі свету ў XXI ст., відавочна, не выпадковасць. Мы, беларусы, можам і па-вінны ўспрымаць яго як прызнанне з боку ААН нашых несумненных дасягненняў па рэалізацыі абодвух фундаментальных прынцыпаў ААН — "адукацыя для ўстойлівага развіцця" і "адукацыя для ўсіх". Па-першае, у Беларусі даўно на практыцы вырашана праблема ўсеагульнай пісьменнасці і доступу да якаснай адукацыі. Па-другое, шмат у чым дзякуючы вырашэнню першай праблемы наша краіна дэманструе ўстойлівы эканамічны рост і сацыяльнае развіццё ў вельмі няпростых умовах пераходнага перыяду і рэзкага абвастрэння міжнароднай канкурэнцыі.

**Валерый БАЙНЁЎ,**
**член працоўнай групы па правядзенні Міжнароднага форуму, доктар эканамічных навук, прафесар кафедры менеджменту БДУ**

## СПОРТ

# СПАРТЫЎНЫЯ ІНТЭРНАТЫ

У рамках спартакіяды сярод інтэрнатаў БДУ праходзілі спаборніцтвы па баскетболе. 9 каманд на працягу некалькіх тыдняў акупавалі спартыўную залу галоўнага корпуса. 24 сакавіка ў фінальнай гульні сустрэліся зборныя 7-га і 10-га інтэрнатаў. Перамогу святкавалі хлопцы з "дзесяткі". А ў барацьбе за трэцяе месца больш пашанцавала камандзе інтэрната № 6.

Раней, 15 сакавіка, у памяшканні корпуса хімічнага факультэта адбыліся спаборніцтвы па шахматах сярод васьмі зборных. І тут пераможцай стала каманда інтэрната № 10 (Віталь Валянюк, Сяргей Быкаў і Яўгенія Беразюк). Другое месца занялі жыхары інтэрната № 2, трэцімі сталі студэнты з "тройкі".

# ФАКУЛЬТЭТ НА ФАКУЛЬТЭТ

Працягваюцца спаборніцтвы паміж факультэтамі БДУ ў праграме студэнцкай спартакіяды. Пераможцамі ў баталіях па настольным тэнісе сталі спартсмены юрфака. На адну пазіцыю ад іх адстала зборная ФМА, трэцяе месца заняла каманда геафака.

Добра паказалі сябе і дзяўчаты з юрфака ў жаночым валейболе. Атрымаўшы "золата" спаборніцтваў, яны апярэдзілі каманды мехмата і ФМА, якія занялі другое і трэцяе месцы адпаведна.

Гуляць у шахматы лепш за ўсё ўдаецца радыёфізікам. Зборная гэтага факультэта першынствавала ў спаборніцтвах. "Срэбра" дасталося ФПМіЭ, а на трэцяй прыступцы п'едэстала апынулася каманда мехмата.

**Аляксандр САЛАМАХІН**

# ТУРНІР ПА У-ШУ

Традыцыйны рэспубліканскі турнір па у-шу на прызы Беларускага дзяржаўнага універсітэта адбыўся 11—13 сакавіка ў Гродне. Сёлета ён прысвячаўся 60-годдзю Перамогі. У спаборніцтвах прынялі ўдзел больш за 120 спартсменаў з Мінска, Віцебска, Мазыра, Салігорска, Ашмянаў, Ліды, Гродна і інш. Спартсмены спаборнічалі ў дзвюх узроставых групах — дарослыя і юніёры. Пераможцамі турніру ў розных катэгорыях сталі Акмал Усманаў (56 кг, Гродна), Сяргей Іваноў (60 кг, СДЮШАР № 7, Мінск), Сямён Тырля (65 кг, Гродна), Анатоль Гурскі (70 кг, Гродна), Юры Жывалеўскі (75 кг, Гродна), Андрэй Андрэеў (85 кг, Віцебск), Віталь Міхельсон (90 кг, Мінск). Прызы пераможцам уручыў старшыня Беларускай федэрацыі у-шу, прарэктар БДУ Уладзімір Захаравіч Спірын. Наступная сустрэча спартсменаў адбудзецца 22—24 красавіка на чэмпіянаце Беларусі ў Мінску.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

## ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

*В.А. Костюк, А.И. Потапович.* **Биорадикалы и биоантиоксиданты.** У манаграфіі выкладаюцца сучасныя ўяўленні пра класіфікацыю, фізіка-хімічныя ўласцівасці, механізмы ўтварэння актыўных формаў кіслароду і іншых біярадыкалаў.

**Обучение иноязычной речевой деятельности. Методические рекомендации для преподавателей иностранных языков.** *Под общей редакцией Л.В. Хведчени.* Дапаможнік прызначаны для выкладчыкаў-практыкаў, якія выкарыстоўваюць у навучальным працэсе сучасныя тэхналогіі і метады навучання.

**Практика устной речи. В 2 ч. Ч. I.** У першую частку навучальнага дапаможніка для студэнтаў II курса, якія вывучаюць англійскую мову як асноўную, уключаны 10 аўтэнтычных тэкстаў на тэмы прафесійнай дзейнасці і здароўя розных жанрава-стылёвых разнавіднасцей, урыўкі з мастацкай прозы, часопісных і газетных артыкулаў.

*А.Р. Хромчанка.* **Паўночна-мастоўскія гаворкі: арэальная, генетычная і тыпалагічная характарыстыка.** У манаграфіі разглядаюцца асаблівасці паўночна-мастоўскіх гаворак на ўсіх узроўнях моўнай сістэмы. У працу ўключаны таксама слоўнік рэгіянальнай лексікі і ўзоры транскрыбаваных тэкстаў.

*В.В. Гарбачова.* **Удзельнікі паўстання 1830—1831 гг. на Беларусі.** Біябібліяграфічны слоўнік. У слоўніку на аснове сабранага матэрыялу з архіўных і бібліятэчных сховішчаў Беларусі, Літвы, Расіі і Польшчы прадстаўлены персаналіі ўдзельнікаў паўстання 1830—1831 гг. на Беларусі.

*В.М. Юрин, А.П. Кудряшов.* **Ксенофитофизиология.** У дапаможніку даюцца метадычныя рэкамендацыі, неабходныя для выканання лабараторных работ і падрыхтоўкі семінараў, а таксама матэрыялы для кантролю самастойнай работы студэнтаў.

*А.М. Лукашэвіч.* **Беларусь напярэдадні і ў час вайны 1812 г.** Вучэбна-метадычны комплекс складаецца з 6 навучальных модуляў. Багаты лекцыйны матэрыял змяшчае вялікую колькасць даступна выкладзенай інфармацыі.

*Л.У. Бярэйшык, А.А. Гужалоўскі.* **Музеі замежных краін. У 2 ч. Ч. I. Музеі Еўропы.** У кнізе прадстаўлены сучасныя сусветна вядомыя і найбольш цікавыя еўрапейскія музеі. Разглядаюцца такія




пытанні, як арганізацыя музейнай справы ў краінах Еўропы, гісторыя фарміравання музейных калекцый, экспазіцый і выстаў.

**Основы права.** *Авторы-составители А.Р. Леонович, А.В. Шидловский.* У практыкуме для студэнтаў неюрыдычных спецыяльнасцей змяшчаюцца планы практычных заняткаў, задачы, кантрольныя пытанні, літаратура да тэм.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы**

СПОРТ

# ПЕРАМОЖЦЫ СПАРТАКІЯДЫ

***Узнагароджанне найлепшых спартсменаў БДУ па выніках агульнауніверсітэцкай спартакіяды 2003—2004 навучальнага года адбылося 24 сакавіка ў ліцэі БДУ. Прадстаўнікі ўсіх факультэтаў сабраліся ў актавай зале ліцэя, каб павіншаваць студэнтаў, якія дасягнулі найлепшых вынікаў, і іх трэнераў.***






Святы і ўрачыстасці ў жыцці спартсмена здараюцца рэдка. Значна часцей адбываюцца трэніроўкі, зборы і спаборніцтвы. Вось і на гэты раз было бачна, што "віноўнікі" свята крыху сароменоцца сваёй славы. Асабліва няёмка спартсмены адчувалі сябе, калі выходзілі на сцэну, каб атрымаць заслужаныя ўзнагароды. Дый да вячэрніх гарнітураў, як здалося, яны прывыклі менш, чым да спартыўнай формы, у якой выступаюць на спаборніцтвах і якая дапамагла ім стаць героямі вечара. Найбольшая ўвага, безумоўна, дасталася прадстаўнікам факультэтаў, якія занялі прызавы п'едэстал. Пераможцай нядаўняй спартакіяды стала каманда геаграфічнага факультэта, на другім месцы — зборная юрфака (леташні пераможца), а трэцяя прыступка — у фізічнага факультэта. Для астатніх каманд прагучала пажаданне перамагаць больш.

Таксама адбылося ўзнагароджанне найлепшага спартсмена БДУ за мінулы год. Ім стаў студэнт-пяцікурснік юрыдычнага факультэта, вядомы на ўсю краіну алімпіец, чэмпіён свету па лёгкай атлетыцы Андрэй Міхневіч. У гэты вечар гледачам давялося непасрэдна ўбачыць многіх беларускіх алімпійцаў — студэнтаў нашага універсітэта. На сцэну былі запрошаныя Андрэй Міхневіч, Наталля Сафронава, Андрэй Чэхаўскі, Барыс Грынкевіч, Павел Лагун (усе з юрфака), Максім Мірны (ФМА), Наталля Цылінская, Аляксандр Кікянёў (усе з геафака) і Надзея Астапчук (гістфак). На жаль, не ўсе яны здолелі прыняць удзел у мерапрыемстве, бо знаходзіліся ў гэты час на спаборніцтвах.

Разам з іншымі спартсменаў віншавалі музычныя групы і танцавальныя калектывы. Акрамя таго, некаторыя з "віноўнікаў" свята выступілі ў прывычным амплуа і наладзілі на сцэне яркія і відовішчныя паказальныя выступы. Таму можна сказаць, што вечар атрымаўся спартыўным.

**Аляксандр САЛАМАХІН**
**Фотаздымкі Аляксандра СНАПКА**

НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

# ПРЫГАЖУНІ БДУ

***24 сакавіка ў сталоўцы інтэрната № 5 адбылося чарговае спаборніцтва паміж універсітэцкімі прыгажунямі "А ну-ка, дзяўчаты — 2005".***

Студэнткі спрабавалі свае сілы ў некалькіх конкурсах. "Дэфіле" патрабавала ад іх увагі і засяроджанасці да кожнага руху, нават да простай усмешкі. Дзеля гэтага дзяўчыны некалькі тыдняў хадзілі на спецыялізаваныя заняткі да Сашы Варламава і яго памочніц. Намінацыя "Вобраз", у якой студэнткі расказвалі і паказвалі журы "сябе любімых", ператварылася ў сапраўднае тэатралізаванае шоу.

Каб не крыўдзіць дзяўчат, кожную з іх журы ўзнагародзіла ў якой-небудзь з намінацый. Званне "Сама дасканаласць" і першае месца атрымала Святлана Грыгелес (інтэрнат № 7). На другім месцы апынулася "Чароўнасць" Настасся Такоева (інтэрнат № 2). Узнагарода за артыстызм і трэцяе месца дасталіся Таццяне Згірскай (інтэрнат № 1). У намінацыі "Стыль" перамагла Вольга Труханавец (інтэрнат № 10), "Грацыя" — Святлана Юркова (інтэрнат № 9), "Усмешка" — Надзея Кубар (інтэрнат № 4), "Арыгінальнасць" — Алена Сачынская (інтэрнат № 6), "Шарм" — Алеся Алейнік (інтэрнат № 3), "Загадка" — Аксана Баклага (інтэрнат № 5). Але ж мы з вамі ведаем, што ў Беларусі ўсе дзяўчаты "самыя-самыя".



**Алёна КРЫЎКІНА**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# ЛАЎРЭАТЫ ФЕСТЫВАЛЮ ЭСТРАДЫ

***18 сакавіка ў ліцэі БДУ адбыўся заключны этап універсітэцкага фестывалю эстрады. Пераможцы былі ўзнагароджаны дыпломамі лаўрэатаў і падарункамі: музычнымі дыскамі з запісам выступленняў з самога мерапрыемства, шклянымі сувенірамі з лагатыпам фестывалю.***

У намінацыі "Канферанс" пераможцамі сталі Надзея Белюк, Максім Заранок (мехмат), Надзея Бабова, Мікалай Брэдзелеў (ФФСН), Ганна Ляўшук, Арцём Праскаловіч (юркаледж). Яўген Якіменка (ФПМІ) вызначыўся ў намінацыі "Гутарковы жанр". У намінацыі "Эстрадная песня" былі адзначаны Яўген Леўчанка (ваенфак), Яўген Ермаковіч (геафак), Ірына Мірашнічэнка (ФФСН), Ірына Агейчык (біяфак), Марыя Аўдзеева (хімфак), Юлія Трыпуцька (філфак), Андрэй Шопік (ФФСН), Дзмітрый Калдун (хімфак). Ансамбль "Глорыя" з ліцэя БДУ быў адзначаны як найлепшы ў намінацыі "Народны танец". А ў намінацыі "Класічныя спевы" пераможцай стала Ірына Лой (Інстытут тэалогіі). Дзяніс Яраш (фізфак), Андрэй Шэляпко, Канстанцін Пархімовіч, Наталля Ільюшчанка (хімфак) і Максім Квяткоўскі (ліцэй БДУ) сталі лаўрэатамі ў намінацыі "Майстэрства выканання". У намінацыі "Эстрадны танец" вызначыліся Яўгенія Рэнгарт, Таццяна Марчук (ФПМІ). Намінацыя "Спартыўны танец" стала шчаслівай для Алега Усава (філфак), Брэсібе Аінтарэ (факультэт даўніверсітэцкай адукацыі), а таксама Алены Воўк і калектыву " Нон-стоп" (юрфак). Спецыяльны прыз часопіса "РиО" атрымалі Алеся Сядзяка, Шаген Аганаў, Юрый Матросаў (ФМА). А прафкам студэнтаў БДУ свае спецыяльныя прызы ўручыў Аляксандру Чыжу (мехмат), Ганне Мартынавай (геафак) і Кацярыне Скрыган (біяфак).

**Алёна КРЫЎКІНА**

# ШУКАЕМ КЛОУНАЎ

На мінулым тыдні ва універсітэцкім аддзеле па справах культуры быў зарэгістраваны вядомы раней студэнцкі комік-гурт "3+2". Руды Ціша (галоўны клоун гурта) сказаў: "Мы плануем пашырыць свой састаў на 2 чалавекі (3 асноўныя ўжо ёсць). Запрашаем усіх жадаючых на маленькі карпаратыўны кастынг, які адбудзецца 8 красавіка (вул. Курчатава, д. 8, кавярня "Прынцэса") а шостай гадзіне вечара. Асобны зварот да дзяўчат: "Не турбавацы!"

**Алёна КРЫЎКІНА**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года

31 сакавіка 2005 года
Падпісана да друку 30.03.2005 г.
Зак. 314. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 2
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by